Літаратурная Беларусь

Выпуск №7 (119)
(ліпень)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by

Змест

Ватыканскія архівы Скарыны

Новыя звесткі пра біяграфію і постаць беларускага першадрукара Францыска Скарыну адшукаў Алесь Жлутка, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Беларусі.

Падчас камандзіроўкі ў Ватыкан даследнік удакладніў сувязь першадрукара з Пятым Латэранскім саборам, які адбыўся ў 1512–1517 гадах. На тым саборы прымала ўдзел дэлегацыя дацкага караля, у складзе якой быў «нейкі» Скарына. А праз тры месяцы ўжо дакладна Францыска Скарыну пры абароне доктарскай працы ў Падуі называюць сакратаром дацкага караля Ганса. Ці пра адну і тую ж асобу ідзе гаворка ў розных крыніцах — задумаўся навуковец. Падчас працы ў Ватыканскім архіве Алесь Жлутка знайшоў цікавыя дакументы, у якіх сакратар дацкага караля паведамляе пра тое, што да Пятага Латэранскага сабору хацеў далучыцца маскоўскі цар. Даследнік адзначыў, што ў часе працы з дакументамі высвятляюцца надзвычай цікавыя рэчы: перад 1508 годам дацкі кароль Ганс прымаў у сябе дэлегацыю ад маскоўскага цара Васілія ІІІ. Паслы прасілі караля дамовіцца з Папам Рымскім Юліем ІІ аб доступе маскоўскага пасольства да Ватыканскага двара. Вядома, што дацкі манарх стараўся праз французскага караля паспрыяць уладкаванню маскоўскіх паслоў у Ватыкане. Падчас гэтых і наступных перамоў дацкі кароль спрабаваў дамовіцца з Васілём ІІІ аб паяднанні Цэркваў.

«У 1509 годзе да дацкага двара прыбыла таксама дэлегацыя польскага караля і Вялікага князя Жыгімонта, у падданстве якога на землях Беларусі і Украіны таксама былі праваслаўныя і дзе дакументацыя вялася на лаціне і старабеларускай мове. Узнікае пытанне: дзеля чаго патрэбны быў Скарына дацкаму каралю ў якасці сакратара? Адказ напрошваецца сам сабой: для дыпламатычных зносінаў з Жыгімонтам і Васіліем ІІІ. Скарына выконваў экуменічную місію ў справе паяднання двух галінаў хрысціянства. Вельмі верагодна, што ў Даніі ён і атрымаў медычную адукацыю, каб пасля абараніць дактарат па медыцыне ў Падуі», — адзначае даследнік, аднаўляючы храналогію падзей, якія адбыліся больш за пяць стагоддзяў таму. Атрымаць медычную адукацыю Францыск Скарына мог з 1509 па 1512 год, але пакуль гэта толькі тэорыя, бо менавіта гэты час яшчэ застаецца белай плямай у ягонай біяграфіі. У любым выпадку, тое, што Скарына мог быць непасрэдным удзельнікам дацкай дэлегацыі на Пяты Латэранскі сабор — вельмі важная акалічнасць, мяркуе Алесь Жлутка. Гэта не дзіўна: Скарына атрымаў адукацыю і ва ўсходняй, і ў заходняй хрысціянскай традыцыі, вучыўся ў каталіцкіх універсітэтах, працаваў пры дварах дацкага караля і віленскага біскупа, выдаваў Біблію і літургічныя кнігі для праваслаўных вернікаў. «Пашыраецца дыяпазон ягонай асобы, пашыраецца дыяпазон перамяшчэнняў Скарыны па Еўропе. Гэта кажа пра тое, што ён быў асобай рэнесанснага тыпу. А як вядома, дзеячы Адраджэння ў той час даволі шмат падарожнічалі па Еўропе, набываючы веды і працуючы ў розных галінах. А яго дзейнасць у экуменічным кірунку сведчыць аб шырыні светапогляду, аб яго адкрытасці. Тое, што ён мог удзельнічаць у справе паяднання падзеленых частак хрысціянства напярэдадні новага падзелу, які несла блізкая Рэфармацыя, надае яшчэ большую веліч ягонай постаці», — упэўнены навуковец.

Доктар медыцыны і свабодных навук, магчымы ўдзельнік дыспутаў з Парацэльсам — вядомым містыкам XVI стагоддзя, і Марцінам Лютэрам, безумоўна, велічная, але і таямнічая постаць, — усё гэта Францыск Скарына. Алесь Жлутка прызнаўся, што ісці крок за крокам па слядах першадрукара –нібы разблытваць дэтэктыў, фінал якога на сённяшні дзень невядомы, бо нават месца смерці Скарыны пакуль дакладна невядомае. Затое можна амаль з пэўнасцю ўзнавіць звесткі пра першую палову ягонага жыцця, у прыватнасці — пра тое, дзе Скарына атрымаў першапачатковую адукацыю і рэлігійныя веды. Названы ён быў у гонар святога Францыска Асізскага — патрона кляштару бернардынцаў у Полацку, пры якім і атрымаў веды лацінскай мовы, а веды ў праваслаўнай традыцыі і ў старабеларускай кніжнай мове — пры адным з полацкіх праваслаўных манастыроў.

Усе новыя звесткі абавязкова будуць апублікаваныя: навукоўцы плануюць выдаць новы зборнік дакументаў аб жыцці і дзейнасці Скарыны, і, магчыма, ён убачыць свет ужо ў 2017 годзе. «Запланавана выданне на новых агіграфічных прынцыпах і адпаведным навуковым узроўні, бо за мінулы з папярэдняга выдання час з'явіліся новыя звесткі, былі знойдзеныя новыя дакументы. Таксама будуць папраўлены ўжо апублікаваныя дакументы, будуць дададзеныя факсіміле. Трэба на новым факталагічным узроўні прадставіць асобу Скарыны», — адзначае Алесь Жлутка.

Асэнсаваць постаць Скарыны яшчэ трэба будзе многім, і нагода адпаведная ёсць: у 2017 годзе ўвесь свет адзначыць пяцісотгоддзе першай друкаванай Бібліі Скарыны. Праца па вывучэнні ягонай біяграфіі вядзецца цяпер шматлікімі ўстановамі Беларусі, а ўлічваючы веліч і знакамітасць гэтай постаці, узнікла нават ідэя надаць нацыянальнаму аэрапорту Беларусі імя Францыска Скарыны.

radiovaticana.va

Конкурс «Экслібрыс» імя Антона Луцкевіча

1 сакавіка 2016 года Саюз беларускіх пісьменнікаў абвесціў пра пачатак прыёму прац на конкурс «Экслібрыс», які сёлета мае імя Антона Луцкевіча і прысвечаны крытыцы і літаратуразнаўству.

Тэма конкурсу — «Сучасная беларуская літаратура XXI стагоддзя: імёны, тэндэнцыі, перспектывы (ад 2000 — па сёння)».

Да ўдзелу запрашаюцца даследчыкі літаратуры, крытыкі і літаратурныя журналісты, якія пішуць на беларускай мове, ва ўзросце да 35 гадоў.

Конкурс праводзіцца ў дзвюх намінацыях:

— Літаратурная крытыка (артыкулы, рэцэнзіі, водгукі, эсэ, нарысы);

— Літаратуразнаўства (навуковыя артыкулы, агляды).

Тэксты на конкурс можна дасылаць файламі ў фармаце .doc да 1 верасня 2016 года на адрас sbp@lit-bel.org, пазначыўшы тэмай ліста «Экслібрыс». У лісце мусіць быць наступная інфармацыя: імя, прозвішча, дата нараджэння ўдзельніка, кантактны нумар тэлефона і e-mail.

За ходам конкурсу сачыце на сайце http://lit-bel.org/.

Прэс-служба Саюза беларускіх пісьменнікаў

Прэмія імя Карласа Шэрмана

Сузаснавальнікамі новастворанай прэміі з'яўляюцца Саюз беларускіх пісьменнікаў, Беларускі ПЭН-Цэнтр і Міжнародны дабрачынны фонд «Вяртанне».

Узнагарода будзе ўручацца перакладчыкам за мастацкую перакладную кнігу, якая была апублікавана ў годзе, што папярэднічае году намінацыі на прэмію. У выключных выпадках прэмія, калі пераклад на беларускую мову рабіўся некалькімі асобамі, можа быць падзеленая паміж імі.

Намінаваць прэтэндэнтаў на прэмію могуць выдавецтвы, творчыя аб'яднанні і самі перакладчыкі. На іх ляжыць абавязак прадставіць да 15 верасня на разгляд журы прэміі электронныя версіі і два папяровыя асобнікі намінаваных кніг. Папяровыя асобнікі прымаюцца па адрасе Саюза беларускіх пісьменнікаў (220012, Мінск, вул. Кузьмы Чорнага, 31-906), электронныя варыянты — на адрас: konkurs.pierakladau@gmail.com

Прэмія за найлепшую перакладную кнігу заснаваная ў гонар выдатнага беларускага літаратурнага перакладчыка Карласа Шэрмана (1934–2005). Плануецца, што першая цырымонія ўзнагароджання адбудзецца ў дзень нараджэння Карласа Шэрмана: 25 кастрычніка.

Прэс-служба Саюза беларускіх пісьменнікаў

Зміцер Колас і «Паэты планеты»

Выдавец Зміцер Колас заснаваў новую кніжную серыю «Паэты планеты», першыя шэсць кніг якой ужо выйшлі з друку.

Творы Сапфо, Пятраркі, Рансара, Шэкспіра, Гётэ, Габрыэлы Містраль падаюцца ў найлепшых перакладах прадстаўнікоў некалькіх перакладчыцкіх пакаленняў — ад Уладзіміра Дубоўкі і Юркі Гаўрука да Ганны Янкута і Антона Францішка Брыля.

Усе выданні маюць зручны кішэнны фармат, сярэдні кошт аднаго асобніка — тры з паловай дэнамінаваныя рублі.

У планах выдаўца на найбліжэйшы час выданне ў серыі шэдэўраў лірыкі Рыльке, Хаяма, Катула, Гёльдэрліна, Каханоўскага, Апалінэра, Катры Валы... Усіх маркуецца выдаць каля 75 кніг серыі.

Усе яны маюць арыгінальнае афармленне, распрацаванае колішнім выпускніком Коласаўскага ліцэя Марцінам Русецкім.

Алена Ігнацюк: «Будзе ўсё наадварот»

У серыі «Кнігарня пісьменніка» СБП пабачыла свет новая кніга паэзіі Алены Ігнацюк «Будзе ўсё наадварот».



З яе старонак на нас глядзіць лірычны герой — інтэлігент, які на ўлонні прыроды назірае за аблокамі і разважае пра сутнасць поглядаў Сакрата і Мандэльштама.

Трэцяя кніга паэткі прытрымліваецца канцэпту першых двух. У ёй працягваюцца бясконцыя шуканні, але ўжо з пэўным досведам. Гэтую з'яву можна прасачыць па вобразе паэзіі, створаным Аленай Ігнацюк. Калі ў першым зборніку паэзія-дзіця шукае ідэалізаванага гаспадара, а ў другім гераіня толькі вучыцца яе апранаць, «Будзе ўсё наадварот» апісвае ўжо больш сталую паэзію, якая вядзе гераіню за сабой (ці яны ідуць разам як роўныя).

«Куды ж паэзія вядзе? У свет мастацтва, які неадлучны ад культуры, бо культура, як вядома, трымаецца на трох кітах: гэта розум, пачуцці (хараство) і мараль (дабро)», — абгрунтоўвае паэтка новы штрых у стварэнні вобраза.

Алена Ігнацюк выкладае ў Палескім дзяржаўным універсітэце «Тэорыю і гісторыю сусветнай культуры». Асноўным сэнсам культуры яна лічыць чалавекатворчасць. Кажа, што інтэлігентнага, неадлучнага ад культуры чалавека з яе дапамог зрабіць уласны знак задыяку — Рыбы. А на другую — узнёсла-рамантычную — частку асобы паўплывала эпоха, час, у якім яна нарадзілася, — 1960-я гады.

Для каго піша Алена Ігнацюк? Здаецца, свайго чытача яна ведае ў твар.

«Я думаю, што майму чытачу — за 40 амаль. І яго вызначэнне адпавядае стылёвым праграмам маёй паэзіі. І ён зусім не рэаліст, хутчэй імпрэсіяніст, мадэрніст, авангардыст.

Што б хацелася да яго данесці? Культуралагічную думку, што чалавецтву патрэбна вярнуцца да страчанага ім калісьці раю і страчаных ідэалаў; данесці і тое, што мы абралі заніжаную планку, каб назваць сябе асобамі».

Тэксты новай кнігі Алена Ігнацюк адносіць да «адваротнага». Па словах аўтаркі, гэта больш часавая катэгорыя, якая ідзе ад космасу, ад інтуіцыі, ідзе заўсёды пад знакам «+».

Алена Босава

Сорак дзён па Ігару Канановічу

19 чэрвеня трагічна загінуў малады паэт, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў, аўтар кнігі «Астэроід» Ігар Кананові.

Сакратарыят «Саюза беларускіх пісьменнікаў», сябры і аднадумцы выказалі глыбокія спачуванні родным і блізкім Ігара. Яго трагічны сыход — вялікая страта для літаратурнай Беларусі.

Ігар Канановіч нарадзіўся 22 ліпеня 1983 года ў Клецку. У 2000-м скончыў Заастравецкую СШ Клецкага раёна. У 2003 годзе паступіў на беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта БДУ. Пасля заканчэння ў 2008–2013 гадах працаваў настаўнікам беларускай і рускай моў у школах Клецкага раёна. Пазней жыў і працаваў у Мінску.

Публікавацца пачаў у 2006 годзе. Друкаваўся ў часопісах "Дзеяслоў" і «Верасень».

Развітанне з Ігарам адбылося на яго малой радзіме ў Клецку.

На саракавіны пасля сыходу Ігара ў іншы свет «Літаратурная Беларусь» змяшчае развітальныя словы аб ім...

Фота Вікі Трэнас

«Я толькі адступіў, а не ўцёк...»

Памяці Ігара Канановіча

Ён пайшоў сімвалічна — у дзень народзінаў свайго куміра Васіля Быкава. Зрабіў свой апошні крок з даху дома на праспекце Незалежнасці — разбегся і паляцеў. Паляцеў туды, дзе, як ён верыў, жыццё лепшае, чым у роднай Беларусі.

Ён на ўсё меў свае меркаванне, асобнае, заўсёды трымаўся сваіх слоў, нават калі ўсе астатнія казалі, што яму варта не ўпарціцца, а пагадзіцца з большасцю, не спрачацца і не даводзіць, а схіліць галаву.

«Удалячынь гляджу з кар'ернай кручы» — спяваў Ігар у адной са сваіх песняў... Цяпер гэтыя словы ўспрымаюцца зусім інакш. Цяпер у кожным ягоным слоўцы бачыцца намёк для нас, родных і сяброў... Намёк, які мы не заўважылі. Даруй, родненькі...

Мы пазнаёміліся на філфаку ў 2003 годзе, і з таго часу Ігар стаў маім найлепшым і самым верным сябруком і аднадумцам. Ён здаваўся такім сталым, разважлівым, спакойным і засяроджаным вельмі. Да яго цягнула. Бывалі і цяжкія часы... Ігар заўсёды падтрымліваў мяне... Памятаю, казаў пра намётавае мястэчка: «Зялінская, калі ты туды пойдзеш, я табе эпітафію напішу!». Мы смяяліся, ён баяўся, што буду пабітая. Хваляваўся за мяне. Мяне і «пабілі». Калі выйшла праз свае восем сутак, Ігар быў першым, хто сустрэў мяне ў вестыбюлі факультэта, падышоў, абняў моцна-моцна... А я, памятаю, спыталася: «Ну, дык дзе мая эпітафія?! Паказвай хутчэй!». Вельмі доўга ён цягнуў з маёй «эпітафіяй», а ў выніку прысвяціў мне песню...

Ён часта пісаў для сяброў... Пісаў выдатныя, вельмі шчымлівыя песні і вершы. Цяпер кожнае слоўца ягонае ўспрымаецца інакш, чым тады, у момант, калі ён прадстаўляў сябрам творы свае...

Пасля заканчэння БДУ ён з вялікім энтузіязмам распавядаў пра сваю працу ў школе. Яго цягнула да дзяцей, а дзеці вельмі любілі яго. Так, яго моцна засмучала пnative прыніжанасць Настаўніка. Сістэма адукацыі ў краіне, дзе настаўнік — ледзь не апошні чалавек, з якога можна здзекавацца, дурыць яго, дзе кожны крок і любая ініцыятыва захлынаюцца. Але Ігар спрабаваў змагацца. Не дазваляў сябе прыніжаць.

Аднойчы напісаў мне: «Дашуня, трэба нешта рабіць, клецкі РАНА абвясціў негалосны конкурс: хто з настаўнікаў збярэ са сваім класам па горадзе больш бутэлек за вызначаны тэрмін, клас таго паедзе на экскурсію ў Менск! Я што — зусім нічога не варты, каб у летнім лагеры прымушаць дзяцей у мясцовых беспрытульных бутэлькі адбіраць?! Што гэта за конкурс такі?! Афіцыйнага загаду няма, толькі на словах, але два кантэйнеры для бутэлек на тэрыторыі школы з раніцы стаяць! Старэйшыя прамаўчаць, схіляць галовы, але ж некаму трэба змагацца і за дзяцей, і за іх!». Мы стэлефанаваліся з «Еўрарадыё», Ігар распавёў аб тым, кантэйнеры і загад дурны зніклі, як і не было. Начальства здагадвалася, што гэта ён паскардзіўся, але наўпраставых абвінавачанняў не выставіла.

Дзеці вельмі любілі свайго Ігара Васільевіча. Арганізоўваў для іх розныя клубы па цікавостках, часта збіраў іх і вадзіў у паходы... Памятаю, калі звольніўся, на ягонай старонцы «Укантакце» дзеці ледзь не плакалі: «Ігар Васільевіч, куды Вы ад нас?!», «А хто ж цяпер з намі?..»...

Я рады гэты дзень пакінуць ззаду.
Баюся, як забытае дзіця.
Бо тут вакол засады, міны, здрады
На сцежках як бы роўнага жыцця...

Ён любіў дзяцей. Вельмі хацеў вучыць і казаў, што і ад іх вучыцца.

Цяжка падбіраць словы, бо мы, родныя і сябры, і дасюль не верым. Вярталася з яго апошніх «гасцей» і думала: мне там з «Нашай нівы» пісалі, каб я сказала пра Ігара колькі слоў, трэба хуценька ўключыць ноўт і спытацца, ці не супраць ён, каб я што напісала пра яго... Спатрэбілася некалькі хвілінаў на ўсведамленне таго, што пытацца пра гэта больш няма ў каго...

Мой харошы, мой надзейны і верны сябар... Так ганарыўся выхадам сваёй першай кнігі «Астэроід». Радаваўся ўступленню ў Саюз беларускіх пісьменнікаў. Столькі планаў было, так многа песняў і вершаў яшчэ не напісанымі засталіся, столькі дабрыні ў сэрцы... Увесь час здавалася: ну што там — паспеем яшчэ сто разоў!

Не паспелі. Не заўважылі. Не абаранілі. Няма і больш ніколі ўжо не будзе.

Раптам узгадалася: смяяліся колькі гадоў таму, што калі не знойдзем асабістае шчасце, то плюнем на ўсё, сыйдземся ды будзем жыць разам, з павагай адно да аднаго, са шкадаваннем і пяшчотай ды вернасцю... Я называла яго «даражэнькі», а ён мяне — «Дашуня». Ён стрымліваў мяне, калі я моцна ўжо чым абуралася, астуджваў, казаў: «Дашуня, беражы нервы!». Казаў, што нашыя нервы яшчэ спатрэбяцца нам у барацьбе за нашую родную краіну. Ніколі не хацеў з'язджаць, кінуць тут усё... І думак такіх не меў. Беларусь, Радзіма — і толькі яны! І ніяк інакш!

Яшчэ не раз дастане моцы
Здзівіць свайго становішча паноў...

Наш родны пайшоў у свой апошні шлях. Разбегся і паляцеў. Паляцеў у свой вырай.

Казаў мне на імпрэзе, прысвечанай дзесяцігоддзю Плошчы-2006, на якую я яго запрасіла і на якой мы побач сядзелі, плячо да пляча... Саромеўся, што не пайшоў са мной на Плошчу ў 2006-м. Казаў, што адчувае сум і правіну... Зрабіў сваю асабістую Плошчу. На якой і загінуў так неспадзявана, так бязглузда для ўсіх. Немагчыма паверыць, што яго больш ніколі не будзе побач.

Усміхаўся мне перад апошнім крокам... Я і не адчувала, што ён сабраўся ў такі далёкі і самотны шлях... Збіраю думкі, як аскепкі...

«Я толькі адступіў, а не ўцёк...»

Родны, ты назаўжды застанешся ў нашых сэрцах. Мы захаваем цябе; у кожнага, хто ведаў, застанецца ў сэрцы частка тваёй шырокай і чыстай душы. Але май на ўвазе, мой дарагі сябрук, што калі мы сустрэнемся Там, табе давядзецца адказаць на маё пытанне: «Як ты мог нас кінуць тут адных?!»

Вечная памяць, мой мілы! Ты заўжды з намі.

А ў памяць пра Ігара наша аднакурсніца пасадзіла ў сваёй вёсцы ў Полацкім раёне алею каштанаў...

Дар'я Зялінская-Макаўчык

Уладзімір Някляеў: «Кожны з нас нараджаецца ўчора, а памірае заўтра»

Сёлета пісьменнік і грамадскі дзеяч Уладзімір Пракопавіч НЯКЛЯЕЎ сустрэў свой 70-ы ліпень. Сустрэў у вандроўках, роздумах і вершах.

Травеньская «Літаратурная Беларусь» апублікавала нізку яго новых твораў з кнігі «Толькі вершы», а сёння — у юбілейныя дні паэта — змяшчае ягоную гутарку на тэмы, не зусім блізкія з паэзіяй: грамадства, палітыка, апазіцыя і ўлада, нацыянальная культура, талент і вера…

Віталь Сямашка: — Спадар Уладзімір, ці не здаецца Вам, што зноў «усё змяшалася ў доме Аблонскіх»? Ці — таксама не мая цытата — «у апазіцыі паехаў дах»?! Узяць нядаўні выпадак, калі перад судом над Вячаславам Сіўчыкам у яго маці Галіны Васільеўны здарыўся сардэчны прыступ з-за кпінаў ды «паклёпаў» на яе сына, што з зайздроснай рэгулярнасцю ўначы з'яўляліся ў Фэйсбуку. Усё пасля ўстаноўчага мітынга з'езда Кангрэса дэмсіл, які ўлады «загналі» на адкрытае паветра і за што Вас таксама судзілі. Увесь гэты раздрай доўжыцца напярэдадні чарговых выбараў у парламент, якія апазіцыя зноў «прадзьме»?

Уладзімір Някляеў: — Мяркуючы па той сітуацыі, што складваецца на сённяшні дзень, будзе так, як сказалі. Змяніць варункі, нібы, час яшчэ ёсць, але не бачу рэальнай волі ў прадстаўнікоў апазіцыйных структур, што разбегліся па сваіх «кватэрах». Надта ж усё нагадвае «прадзьмутую» прэзідэнцкую кампанію. Калі пры чатырохгадовых папярэдніх заклінаннях, што «дасягнем еднасці», «выйдзем з адзіным кандыдатам ды стратэгіяй дзеяння» — усе дамоўленасці аднадушна парушылі. У выніку, па сутнасці, займелі ўсенародную ганьбу. Я ўжо год таму выйшаў з «Гавары праўду», якую ўзначальваў, і з усіх іншых кааліцый, бо не веру, што з іх можа выйсці які толк…

В. Сямашка: — Вашы былыя паплечнікі па «Гавары праўду» гавораць, што з уладамі трэба дамаўляцца. Дайце веры — і Вы спрабавалі гэта рабіць, калі былі старшынёй Саюза беларускіх пісьменнікаў. Але, як вядома, з гэтага нічога не атрымалася.. А Ваш цяперашні сябар і паплечнік Мікола Статкевіч кажа, што з Лукашэнкам можна дамаўляцца толькі «стоячы перад ім на каленях»…

У. Някляеў: — Так, як зазначылі, я і сам спрабаваў з ім кантактаваць, затрацішы на гэта больш за два гады. Але займеў падман, гульню дзеля скарыстання мяне, увогуле беларускай інтэлігенцыі ва ўласных палітычных мэтах. Прынамсі, дзеля таго, каб па ўзору тагачаснага Ельцына, вакол якога «таньчыла» маскоўская камарылля з артыстаў ды спевакоў, стварыць і свой «кардэбалет». І сказаў яму ў вочы, што мо хто і захоча браць у ім удзел, але ж тады не лезьце ў тонкі свет, духоўныя пласты, з якіх складаецца народ, нацыя і дзе нічога не разумееце. Маўляў, працягвайце сабе красці колькі ўлезе, перарабляйце на свой капыл калгасы з саўгасамі. Ён, нібы, са мной пагадзіўся — у культуры ж грошы не ляжаць. Але, прыглядзеўшыся, відаць, адчуў для сабе небяспеку і рэзка развярнуўся ў бок беларусафоба і «галоўнага ідэолага» палкоўніка Замяталіна. Якога і выбраў у супрацьвагу мне. Стала зразумела, што тут дасягнуць нічога не змагу. У гэтым сэнсе шмат хто задае мне зараз пытанні пра перспектывы «новай» палітыкі Захаду ў адносінах да «Рыгоравіча», што ўмоўна называецца «змены праз збліжэнне». У Еўропе даводзяць, што спадзяванні «маюцца». Але фактаў, што маглі б сведчыць пра нейкія плюсы, не стае — няма ніякіх крокаў насустрач дэмакратыі, свабодзе слова, эканамічным і палітычным зменам у краіне. Яшчэ нядаўна шанцы дамовіцца з Лукашэнкам былі, пакуль ён не быў загнаны ў кут, як зараз. А сёння магу толькі пацвердзіць — позна!

В. Сямашка: — Нават не гледзячы на тое, што фінансы спяваюць рамансы?

У. Някляеў: — Ні на што, бо не на волі Боскай ці людской, а сам сябе загнаў у той кут.

В. Сямашка: — Аднак Лукашэнку змогуць прымаць у Еўропе — палітыкі, што адтуль едуць, ужо маўкліва пагаджаюцца з адсутнасцю нашых праваабаронцаў на «вышэйшых» перамовах. Ці, можа, маюць рацыю тыя блогеры ў незалежных СМІ, што пішуць пра «пракідванне Захадам беларускай апазіцыі»?

У. Някляеў: — Я б не звяртаўся з асаблівымі прэтэнзіямі да Еўразвяза. Я нешта не памятаю, каб Беларусь прынесла нешта каштоўнае для той жа Нямеччыны. Каб яна ў адведкі давала грошы з новымі тэхналогіямі ці здабывала беларусам дэмакратыю. Кожны ў гэтым свеце кіруецца сваімі інтарэсамі. Там палітыкаў выбіраюць, і яны адказваюць перад тымі, хто абраў іх кіраўнікамі ці канцлерам. Іншая справа, ёсць дэкляраваная мара стварыць на Усходзе Еўропы свабоднае дэмакратычнае апірышча, і яны на словах ад гэтага не адмаўляюцца. Хоць на справе ўсё атрымліваецца больш чым умоўна… Здаецца, Захаду спрыяльна было б закансерваваць на нейкі час сітуацыю ў Беларусі. Не таму, каб нас «кінуць» ці «аддаць пад дыктатуру». Бо наперадзе ва ўсіх цяжкія часы, і ў ЗША мільгае прывід дэфолту. Таму патрэбныя максімальныя высілкі дзеля захавання ўнутранай эканамічнай стабільнасці. А значыць, каб «налева» не траціліся сродкі. Тым больш, ім вельмі шмат каштавала ўжо Украіна. Так што наш разлік мусіць быць выключна на ўнутраныя сілы. Дзеля гэтага на міжнародны узровень пашыраю з дапамогай нашай эміграцыі рух «За дзяржаўнасць і незалежнасць», працую ў Беларускім кангрэсе дэмсіл.

В. Сямашка: — Зноў жа, Вы працягваеце там выступаць за адзіны спіс апазіцыі на маючых адбыцца выбарах. Але ці ён дапаможа, каб і быў створаны?

У. Някляеў: — У чыстым выглядзе — адзін апазіцыянер па адной акрузе — спіс у прынцыпе не можа быць складзены. Бо заўжды нехта знойдзецца, хто скажа: я таксама іду кандыдатам і пляваў на тое, пра што вы там дамовіліся. Але не гэта галоўнае. Ці падасць апазіцыя сігнал грамадству, што яна адзіная сіла на выбарах, якіх, як ужо бачна, не будзе? Больш таго. Цягнік сыйшоў — рэальнага аб'яднання апазіцыі немагчыма дасягнуць. Бо адны і тыя ж людзі, што дзесяцігоддзямі займаюцца гэтай дзейнасцю, ужо з цяжкасцю адзін аднаго трываюць. І кожны кожнаму не давярае. Таму дамовіцца ў прынцыпе не могуць…

В. Сямашка: — Трэба змена пакаленняў?

У. Някляеў: — Я за тое, але як яна мусіць адбыцца? Ну сыйшлі ўсе гэтыя Някляевы, Шушкевічы-Статкевічы ды Мілінкевічы-Лябедзькі з Калякінымі. І хоп — на пустэчы ўзнікла нешта прынцыпова-новае?! Не! Працэс будзе доўгі, складаны і звязаны, канечне, з асобамі. Але — якія будуць праяўляцца ды вылучацца не ў кабінетах, а ў часе падзей. А падзеі будуць вельмі сур'ёзныя. У звязе з той жа рэцэсіяй, што будзе паглыбляцца. Сацыяльнай напружанасцю, што будзе нарастаць. Урэшце, з асэнсаваннем таго, што Беларусь знаходзіцца пад рэальнай пагрозай знікнення. І ўсё ж такі, працуючы з мноствам людзей, ведаю, што знойдуцца дзясяткі, сотні тысяч людзей, што гатовыя супраць гэтага паўстаць, нават рызыкуючы дабрабытам ды ахвяруючы сваім жыццём. Я прыкладаю ўсе намаганні, каб дух, нацыянальная свядомасць у нашых людзей расла і расла.

В. Сямашка: — Нехта з мудрых сказаў пра людзей творча апантаных, самадастатковых, што яны глядзяць праз галовы паэтаў і ўрадаў. Вы не шкадуеце, што апынуліся ў сітуацыі, калі палітык часам перамагае паэта?

У. Някляеў: — Калі нешта і можа быць гранічна супрацьлеглым, дык гэта два гэтыя паняткі. Так, неадназова, нібы, прымаў рашэнне абраць нешта адно — і не на карысць грамадскай дзейнасці. Але абставіны заўжды складваюцца так, што не выпадае. Дый бачу, як знікае цікаўнасць да кнігі, да таго, што нясе паэзія, літаратура… Нядаўна вярнуўся з Амерыкі. Мы, бачым, дагэтуль, гаворачы пра яе, прыпамінаем савецкія вобразы «жоўтага д'ябла», паўсюдны расізм. Усё не так! Неверагодна шмат укладаецца грошай у культуру. Пры чым не дзяржавай, а людзьмі ўзроўню Ракфелераў, што наеліся «зялёных», асабістых яхтаў, летакоў. Зразумелі, што да Усявышняга на іх не прыляціш і не прыплывеш. Прыкра, што за лукашэнкаўскія дзесяцігоддзі, калі б краіна цывілізавана развівалася, у нас узнікла б таксама ў першым пакаленні нацыянальная буржуазія. Яе першыя прадстаўнікі, хто памятае, у тых жа 90-ых займаліся дабрачыннай дзейнасцю. А так страчваем у сабе самае асноўнае, на чым мусяць трымацца людзі — глыбіню суадносін з нашчадкамі, продкамі. А ўсё гэта асэнсоўваецца толькі праз Веру, рэлігію, культуру.

Чалавек, народ, дзяржава — гэта штодзённае самабудаўніцтва. І Паэзія, талент, што дадзены мне звыш, мяне зратавалі і ратуюць…

В. Сямашка: — Наколькі Вы веруючы чалавек?

У. Някляеў: — Вырас у сям'і вернікаў, дзе пытанне, ці Ён ёсць, ці няма, не задавалася. Яно, наогул, непрадуктыўнае, таму што, апроч Духа, нішто не стварае чалавека. Усё астатняе можам збудаваць самі: караблі, ракеты. Зараз, калі дачакаўся юбілею, прыгадваю, як цікавіўся ў старэйшых, што ж гэта за такое — доўгае жыццё?! А цяпер разумею, што яго… не бывае. Кожны з нас нараджаецца ўчора, а памірае заўтра. І вось за гэты кароценькі-кароценькі час трэба сябе спраўдзіць, вылепіць у сабе тое, што калі ты быў маленькім, бачылася як ідэал! А гэта і ёсць Гасподзь, што ўбірае ў сабе каханне, сяброўства, адчуванне любасці, шчасця ў гэтым свеце. Якое, быццам, залежыць і ад таго, колькі ў каго грошай, якая ў каго кватэра. Але ж, па вялікім рахунку, — не! Нават калі бачыш уяўнае багацце — асабістыя выспы, палацы за 50 мільёнаў даляраў, што назіраў у Маямі. З прыкрасцю разумееш марнасць тутэйшых «змаганняў» за лішнія пяць-дзесяць метраў у кватэры ці лішнюю градку на лецішчах. І хто колькі адшчыкне ў гэтага рэжыму ці якой іншай улады. Усё гэта дробязнае, пустое, што нічога не дае. Гавару са свайго досведу — я заўжды быў заможным, зарабляючы творчасцю. Ка́палі пры Саветах дывідэнды за вершы і песні такія, што мог купіць за месяц аж дзве «Волгі»…

В. Сямашка: — Ну Макаёнка ж не пераплюнулі!

У. Някляеў (смяецца): — Ніколі не мераўся з Андрэем Ягоравічам. Але ведаю, што і ён не быў шчаслівы праз грашовыя знакі, якія ўспрымаў як апалае лісце, што згарае ў дым. Але ж лятаў на прэм'ерах новых п'ес, што ставіліся паўсюдна ў тэатрах!

Віталь Сямашка: — А ці падлічвалі калі-небудзь колькасць усяго напісанага?

Уладзімір Някляеў: — Ніколі! Не ў тым рэч… Колькі перад намі было людзей, што зрабілі нешта вялікае і былі ўзнятыя сучаснікамі на сцягі ды харугвы! Але, па вялікім рахунку, іх не так і шмат. Мяне радуе часам і дагэтуль не тое, што нават напісаў. А калі сустрэнецца на вуліцы незнаёмца, усміхнецца і раптам прачытае радок з даўняга і мной забытага верша ці праспявае куплет. Я думаю, што лёс чалавечы не такі фатальны, як, па слабасці, мы часам пра яго думаем — маўляў, усё роўна ж усё на нябёсах да нараджэння вызначана ці пад зямлёй. Ці — «як нацыя, як народ нас не існуе»! Я неяк напісаў жартаўлівы верш, калі прыйшлі да Бога беларусы і кажуць: а што з нас узяць, мы ж дурні! Што ж, можна і так жыць на белым свеце, ад слабасці, але не! Чалавек, народ, дзяржава — гэта штодзённае самабудаўніцтва. І Паэзія, талент, што дадзены мне звыш, мяне зратавалі і ратуюць…

Беларускае Радыё Рацыя

Чэрвень 2016 г.

Міжсезонне

Віталія БАГУН

***

Вясна ў нашых шыротах
на ласку асабліва няшчырая —
акіне санлівым позіркам
шэрань дрэваў,
сумётаў капцы,
укруціць сонца
у хмары цяплей,
каб спалася яму
лагодней да лета,
і міма пасунецца,
плёткі птушак
не слухае.

***

Колеру скамечанай,
пажухлай, вясновай
травы, прыцярушанай
соллю і попелам
маіх адчуванняў,
згарэлых у полымі
жарсці, якая злізала
ўсе паролі і коды
з памяці цела,
прадракаюць нам
адраджэнне.

***

Снег зрабіўся рассыпістым,
нібы цукар,
і блакітным, нібы цені,
што ад вясны ўцякаюць
і гуляюць адзін з адным у квача.
Снег зрабіўся брудным
і жаласным, нібы жабрачка —
просіць падаць яму дзён
хто колькі можа,
губіць свае дасканалыя
форму і колер,
сваю непахіснасць
пад бязлітасным поглядам
вясновага сонца.

***

Калі вечарова-вясновы
снег робіцца
насычана-фіялетавым,
губляе цнатліва-бэзавы тон,
калі над золатам
сонца, якое заходзіць,
спадае алавяная
заслона з хмараў,
я гляджу з акна
скрозь дрэваў кра́ты.
Я прыгажосці
спачуваю таксама.

***

Разважаю пра нас,
адчуваю крывалапымі пяткамі
сябе няўклюдай,
як прарастае трава
скрозь зямлі сітавіны,
смакую чаканне
нясмелай вясновай скурай —
як будзе салодка
спавіць нашы душы
сярод сутоння травы.

***

Сёння вясна —
час, калі
жадаеш змяніцца:
расхіснуць крылы
і з жураваў чарадой
на поўнач махнуць —
туды, дзе ты
мяне пачакаць
не жадаеш.

***

Голыя мінскія вуліцы
каштаны аздобілі
зелянінай лістоты,
паставілі свечкі
за здароўе маладзіка,
пад ногі яго вялікасці
яшчэ кінуць ядваб пялёсткаў.

***

У гэтым горадзе
ўсё сезоны дажджоў.
Гэты горад
прадзьмуваецца ўсімі вятрамі.
Скрозь пануруюю бязь
мазаікі плошчаў
праскамі палявымі
выпінаюцца мары.
У гэтым горадзе
надвячорак сцелюць аблокамі.
Гэты горад
гняздо атрутных змей.
Мы блукалі ў горадзе.
Адзін аднаго мы шукалі.
Мы з табой размінуліся,
прамахнуліся сэрцамі
ў лабірынце палыновым
бязрадасных дзён.

***

Калі пухнатай
цёплай хусткай
пакрые снег
кашчавыя асновы
вышынных пабудоў
і беласнежнай чысцінёй
асветліць нарасты
халуп жабрачых
на целе горада,
які пульсуе болем,
залепіць вочы ліхтарам,
накіне вэлюм
на твары вокнаў,
на вуліцы па-хатняму
і ўтульна...

***

Гэты горад
нас не пускае
адзін да аднаго,
ягоныя тратуары,
ягоныя маставыя,
ягоныя храмы,
ягоныя купалы,
ягоныя зоркі,
але...
Мае крокі,
мае масты над ракой,
мае пацеры,
мае праклёны
прынясуць табе моц.
Ты ззяеш,
як сонца.
Толькі на цябе
сетку накінулі
і пасадзілі за краты,
нібы мядзведзя, —
і на паказ па кірмашах.
Толькі ў цябе ёсць нітка.
Толькі ў мяне ёсць іголка.
Толькі ты і я —
мы разам —
назаўжды застаемся вольнымі.

***

Цэлы дзень збіралася неба,
надвячоркам разлілося бярозаю,
просьма прасіла каханага лета
застацца і зноў абдарыць
пацалункамі цёплага ветра;
працавітыя, доўгія рукі
лашчыць ядвабам траў,
аздобленых краскамі;
закалыхваць птушак малых,
нібы дзяцей сумеснага шлюбу;
і кахаць трапятаннем кожным,
кожным шоргатам, кожным імгненнем,
растаючы ў плыні часу.

***

Кожную ноч
падае дождж.
Ён топіць
мае летуценні
ў лужах маркоты
сярод пустэчы
адзіноты маёй.

***

Што можна жадаць
ад паэтаў дваіх,
якія сабраліся разам
даганяць трамвай,
што сыходзіць?
Адкрыццяў пра рыфму браткоў
да зямлі,
алітэрацыі вяргіняў і хрызантэмаў,
асананс верхніх галінак
таполяў, асін і бяроз —
унізе зусім не чуваць,
што на іх струнах
вецер іграе.
Прывабней,
нават інтымней рытм,
што адбіваюць падэшвы
аб бязвольны асфальт.
І пра паэзію словы
разлятаюцца, нібы
вераб'і маладыя,
і гайдаюцца на галінах.

***

Бесклапотнасць —
другое маё імя.
Сёння вецер
гуляе з ёй.
Нібы шчаню палку,
кідае надзеі.
Час шаманіць
у джунглях
чэрвеньскіх траў.
Ён не прапусціць
магчымасць
уджаліць яе балюча.

***

Цішыня...
Адрэзак вуснаў
пануры, бледных,
шчыльна сціснутых
на акружнасці
з чужых пацалункаў.
Салдатка, ты памылілася —
гэта зноў губы не тыя.
Роспач
цераз мозг
скрозь сэрца
у страўнік
тонкай стралой
геліятропа.
Ува мне плавіцца сонца.
Так хораша.
Так балюча.
Цемра...
На тле правага жалудачка
ў сэрцы
ледзь заўважны
сівы, свінцовы
асколак.
Калі салютам
выбухнула наша каханне
ў начным небе Тарндайка
браня са з'едлівых кпінаў
не захавала мяне.

***

Міжсезонне —
як пара ўлюбёная,
скавытанне тужліва-працяглае
сабакі ланцужна-галоднага.
Маркотна
церушыць сонца
пажоўклымі пальцамі
пярыну зімовых хмараў —
улетку не высахла, але
хопіць да вясны пратрываць.
Гола,
вецер вольна гуляе
ў галаве, галінах, кішэнях.
Абыякава
чмякае слота.
Толькі паэтам здольна сагрэцца
іншага паэта чаканне.

***

Снежнем плача зіма.
Няёмка ёй у тутэйшых краях.
Клімат занадта паддатлівы.
Лёгка саступіць
свавольству цыклонаў.
І натоўп абыякавы роспачу,
змораны сівізной
неба, што хмары забрудзілі,
не прагне яскравых кантрастаў,
хараства ільдзяных перакрыццяў.
Ні вясна і ні восень у сэрцы.
Міжсезонне прагнала зіму.

***

У Мінску туман
кладзе цёплыя лапы
на плечы вышынных будынкаў;
казыча пальцамі дрэвы;
нібы вялізны, гуллівы звер
качаецца ўздоўж травы,
быццам ліняе, крыхі
поўсці губляе.
Знікае ўдзень, напалоханы
дапытлівым позіркам сонца.

Забойства на лотасавым ставе



Роберт ВАН ГУЛІК

Гэтая гісторыя адбылася ў 667 годзе да нашай эры ў Ханьюані, старажытным гарадку, узведзеным на беразе возера непадалёк ад сталіцы. Суддзя Дзі мусіць расследаваць забойства старога паэта, які самотна жыў у сціплым маёнтку за Вярбовым кварталам — прыстанішчам куртызанак і спявачак. Паэт, які мірна сузіраў поўню, быў забіты ў садовым павільёне пасярод парослага лотасамі става. Ніякіх сведак не было — ці гэта проста так здаецца?

З маленькага павільёна ў самым цэнтры лотасавага става можна было акінуць поглядам увесь сад, заліты месяцовым святлом. Мужчына ўважліва прыслухаўся. Вакол панавала цішыня. Задаволена ўсміхаючыся, ён зірнуў на мерцвяка ў бамбукавым крэсле і на тронак нажа, што тырчаў у грудзях няшчаснага. На шэрым убранні забітага было ўсяго некалькі кропляў крыві. Чалавек узяў адзін з двух парцалянавых кубкаў, якія стаялі на круглым стале ля алавянага збана для віна, адным глыткам яго асушыў і прамармытаў, нібы звяртаючыся да забітага:

— Спачывай з мірам! Калі б ты проста быў дурнем, я б цябе, можа, і пашкадаваў. Але ж ты быў дурнем надакучлівым...

Ён пацiснуў плячыма. Усё прайшло добра. Мінула поўнач, і ніхто не прыйдзе ў гэтыя самотныя мясціны ля самай гарадской мяжы. У цёмным будынку на іншым канцы сада ні руху. Чалавек агледзеў свае рукі — крыві няма. Тады ён нахіліўся і даследаваў крэсла, на якім сядзеў насупраць забітага, і падлогу павільёна. Не, ніводнага ключа. Небяспекі ніякай, можна сыходзіць.

Раптам ён пачуў за спінай нейкае шлёпанне. Скалануўшыся, ён павярнуўся — і з палёгкай уздыхнуў: гэта была вялікая зялёная жаба, што выскачыла са става на марммуровыя прыступкі павільёна. Цяпер яна сур'ёзна глядзела на чалавека выпупленымі міргатлівымі вачыма.

— Ты, дурніца, гаварыць не можаш, — хмыкнуў чалавек, — аднак лепш я ўсё адно засцерагуся!

З гэтымі словамі ён люта пхнуў жабу нагой так, што яна адляцела і ўдарылася аб ножку стала. Доўгія лапы стварэння заторгаліся і знерухомелі. Чалавек узяў другі кубак віна, той, з якога піла ахвяра, агледзеў яго і схаваў у шырокім рукаве. Цяпер ён гатовы. Ужо збіраючыся сыходзіць, зноў зірнуў на мёртвую жабу.

— Ідзі да сваіх сябровак! — гідліва прамовіў ён і скінуў яе ў ваду.

Цельца з плёскатам знікла сярод лотасаў, і ў той жа момант кваканне сотняў напалоханых жаб узарвала начную цішыню.

Чалавек разлзлавана вылаяўся. Ён хуценька прайшоў па выгнутым мосце, што вёў праз стаў да садовых веснічак. Калі ён выслізнуў вонкі і зачыніў браму, жабы ўжо супакоіліся.

Праз некалькі гадзінаў па дарозе, што вяла ўздоўж возера ў горад, скакалі трое коннікаў. На іх карычневых паляўнічых куртках і чорных шапачках блішчэлі першыя прамяні світальнага сонца. Прахалодны ранішні ветрык трывожыў люстраную роўнядзь возера, аднак неўзабаве яму на змену мусіць прыйсці спёка сярэдзіны лета.

Шыракаплечы барадаты мужчына з усмешкай звярнуўся да свайго старэйшага хударлявага спадарожніка:

— Паляванне на качак падказала мне някепскі спосаб лавіць падступных злачынцаў! Кладзеш прынаду, потым хаваешся, трымаючы напагатове сетку, і як толькі птушачка з'явіцца — тут жа яе і хапаеш!

Чацвёра сялян, што ішлі насустрач коннікам, паспешна паставілі на зямлю свой груз з агароднінай і ўкленчылі на ўзбочча. Яны пазналі барадача — гэта быў суддзя Дзі, галоўны чыноўнік у азёрным краі Ханьюань.

— Мы абluталі сеткамі ўвесь чарот у ваколіцах, пане, — крыва ўсміхнуўшыся, адзначыў крэпкі мужчына, што скакаў ззаду. — І ўсё адно злавілі толькі жменьку водарасцяў!

— Але гэта была добрая трэніроўка, Ма Чжун, — кінуў праз плячо суддзя Дзі свайму памочніку, а потым звярнуўся да хударлявага спадарожніка, што ехаў збоку: — Калі мы кожны ранак будзем паляваць, пане Юань, вашыя пігулкі і парашкі нам ніколі не спатрэбяцца!

Хударлявы змрочна ўсміхнуўся. Яго звалі Юань Кай, і ён быў багатым уладальнікам найбуйнейшай у акрузе аптэкі. Паляванне на качак было яго ўлюбёным заняткам.

Суддзя Дзі прыскорыў каня, і неўзабаве яны ўехалі ў пабудаваны на схіле гары горад Ханьюань. На рынкавай плошчы перад храмам Канфуцыя ўсе трое спешыліся і каменнымі прыступкамі падняліся на вуліцу, дзе над горадам і возерам узвышаўся суд.

Ма Чжун паказаў на каржаватага чалавека, што стаяў ля велічнай судовай брамы.

— Святыя нябёсы! — пракрычаў ён. — Ніколі не бачыў нашага добрага начальніка варты на нагах у такую рань. Баюся, ён сур'ёзна захварэў!

Начальнік варты пабег ім насустрач. Пакланіўшыся, ён ліхаманкава загаварыў:

— Забілі паэта Мэна Ланя, пане суддзя! Паўгадзіны таму сюды прыбег яго слуга і сказаў, што знайшоў цела гаспадара ў садовым павільёне.

— Мэна Ланя? Паэта? — нахмурыўшыся, перапытаў суддзя Дзі. — Я жыву ў Ханьюані ўжо год і ніколі не чуў гэтае імя.

— Ён жыў у старым загарадным доме ля балота на ўсходняй мяжы горада, пане, — прамовіў аптэкар. — Яго тут не вельмі добра ведаюць, бо ў горад ён выбіраўся рэдка. Але я чуў, што ў сталіцы знаўцы вельмі высока ацэньваюць яго паэзію.

— Нам лепш адразу адправіцца туды, — сказаў суддзя і звярнуўся да начальніка варты: — Радца Хун і два мае памочнікі ўжо вярнуліся?

— Не, пане, яны ўсё яшчэ ў вёсцы на захадзе нашай акругі. Сёння ранкам, як толькі пан суддзя выехаў, прыбыў чалавек з паведамленнем ад радцы Хуна. Яны пакуль яшчэ не знайшлі ніводнага ключа, які прывёў бы іх да рабаўнікоў скарбовага пасланца.

Суддзя Дзі патузаў сваю бараду.

— Непрыемная справа гэтае абрабаванне! — раздражнёна прамовіў ён. — Пасланец вёз тузін залатых зліткаў. А цяпер у нас на руках яшчэ і забойства! Што ж, Ма Чжун, мы справімся. Як дабрацца да маёнтка забітага паэта?

— Я ведаю кароткую дарогу праз усходні квартал, пане, — сказаў Юань Кай. — Калі пан дазволіць...

— Будзьце так ласкавы! Начальнік варты едзе з намі. Спадзяюся, са слугой Мэна адправілі некалькі нашых людзей прасачыць, каб ніхто нічога не чапаў?

— Безумоўна, пане! — важна адказаў начальнік.

— Ты робіш поспехі, — адзначыў суддзя Дзі, але заўважыўшы на твары начальніка самазадаволеную ўсмешку, суха дадаў: — Шкада толькі, што вельмі марудна. Вядзі са стайні чатырох коней!

Аптэкар скакаў наперадзе, ведучы кавалькаду праз вузкія завулкі, якія, пятляючы, спускаліся ўніз да ракі. Неўзабаве яны ўжо імчалі па абсаджанай вербамі вуліцы, якая і дала назву Вярбоваму кварталу, прыстанку танцорак і спявачак, што ляжаў ва ўсходняй частцы горада.

— Раскажыце мне пра Мэна Ланя, — папрасіў суддзя ў аптэкара.

— Не магу сказаць, што я добра яго ведаў, пане. Я быў у яго ты ці чатыры разы, і ён падаўся мне прыемным і сціплым чалавекам. Ён атабарыўся тут гады два таму ў старым загарадным доме за Вярбовым кварталам. У тым доме ўсяго тры пакоі, затое побач ёсць вялікі прыгожы сад і лотасавы стаў.

— Сям'я ў яго вялікая?

— Не, пане, у горад ён прыехаў удаўцом. Два яго дарослыя сыны жывуць у сталіцы. У мінулым годзе ён пазнаёміўся з куртызанкай з Вярбовага квартала, выкупіў яе і ажаніўся. Апроч прыгожага аблічча, пахваліцца ёй няма чым — ні чытаць, ні пісаць, ні танчыць, ні спяваць яна не ўмее. Таму Мэну Ланю яна абышлася танна, хоць ён і патраціў усе свае зберажэнні. Ён жыў на сціплую рэнту, якую высылаў са сталіцы яго прыхільнік. Кажуць, шлюб быў шчаслівы, хоць Мэн, безумоўна, быў нашмат за яе старэйшы.

— Я б хутчэй чакаў, што паэт абярэ сабе адукаваную дзяўчыну, — заўважыў суддзя Дзі, — якая зможа раздзяляць яго літаратурныя зацікаўленні.

— Яна спакойная пачцівая жанчына, пане, — пацiснуў плячыма аптэкар. — І добра яго даглядала.

— Мэн Лань быў кемным пакупніком, хай сабе і пісаў паэзію, — прамармытаў Ма Чжун. — Прыгожая спакойная дзяўчына, якая пра цябе клапоціцца, — чаго яшчэ можна жадаць?

Абсаджаная вербамі вулка звузілася і перацякла ў сцяжынку. Яна вяла міма высокіх дубоў і густога падлеску, што сведчыў пра блізкасць балота, якое пачыналася за Вярбовым кварталам.

Перад груба зробленай бамбукавай брамай усе чацвёра спешыліся. Вартаўнікі з суда павіталі новапрыбылых і ўпусцілі іх у двор. Перш, чым увайсці, суддзя агледзеў сад. Утрымлівалі яго не ў вельмі добрым стане. Дэкаратыўныя кусты вакол става пачалі зарастаць і надалі пейзажу нейкай дзікаватай прыгажосці. Над вялікімі лотасамі на роўнядзі вадаёма ляніва пырхалі матылькі.

— Мэн Лань вельмі ганарыўся сваім садам, — прамовіў Юань Кай.

Суддзя кіўнуў. Ён глядзеў на пафарбаваны чырвоным лакам драўляны мост, які вёў да адкрытага з усіх бакоў шасцівугольнага павільёна. Тонкія калоны трымалі востраканечны дах, пакрыты зялёнай чарапіцай. За ставам, у задняй частцы сада, ён убачыў нізкі і неахайны драўляны будынак. Чарацяная страха была напалову схаваная лісцем высокіх дубоў, што раслі за домам.

Спёка мацнела. Суддзя Дзі выцер з ілба пот і прайшоў па вузкім мосце. Астатнія трое крочылі за ім. У маленькім павільёне месца для іх чатырох ледзь хапіла. Суддзя некаторы час разглядаў тонкую фігурку, апранутую ў сціплае хатняе ўбранне шэрага колеру, якая адкінулася на бамбукавым крэсле. Потым памацаў плечы і абмяклыя рукі забітага і прамармытаў:

— Цела толькі пачало калець. Але ж надвор'е вільготнае і гарачае, час смерці вызначыць складана. У любым выпадку, я б сказаў, што пасля поўначы.

Ён асцярожна выцягнуў з грудзей памерлага нож і пачаў вывучаць доўгае тонкае лязо і просты касцяны тронак. Ма Чжун скрывіўся і сказаў:

— Ён нам надта не дапаможа. У любога гандляра скабянымі вырабамі ў горадзе знойдзецца запас такой таннай драбязы.

Суддзя моўчкі перадаў яму нож. Ма Чжун выцягнуў з рукава паперу і загарнуў у яе зброю забойства. Суддзя агледзеў худы твар мерцвяка. На ім застыла злавесная крывая ўсмешка. У паэта былі доўгія касматыя вусы і сівая казліная бародка — суддзя палічыў, што яму гадоў шэсцьдзясят.

Працяг на стар. 12 (6).

Забойства

Працяг.
Пачатак на стар. 11 (5).

Чыноўнік узяў са стала вялікі збан і патрос яго — віна засталося зусім трошкі. Потым падняў кубак, што стаяў побач са збанам, разглядзеў яго і са збянтэжаным выглядам сунуў у рукаў. Павярнуўшыся да начальніка варты, суддзя сказаў:

— Скажы вартаўнікам зрабіць з галля насілкі і аднесці цела ў суд для анатамавання.

Затым, звярнуўшыся да Юань Кая, прадоўжыў:

— А вы пакуль можаце пасядзець на каменнай лаве ля агароджы, пане Юань. Надоўга мы не затрымаемся.

Ён паказаў Ма Чжуну знак ісці за сабой. Яны зноў перайшлі праз мост. Тонкія планкі рыпелі пад вагой двух цяжкіх мужчынаў. Яны абышлі сцяну і скіраваліся да дома. Падышоўшы да ганка, дзе быў цень, суддзя Дзі з асалодай удыхнуў прахалоднае паветра. Ма Чжун пагрукаў у дзверы.

Дзверы адчыніў прыгожы, але пануры юнак. Ма Чжун сказаў, што суддзя хоча бачыць пані Мэн. Калі хлопец паспешліва знік у доме, суддзя сеў за расхістаны бамбукавы стол у сярэдзіне бедна абсталяванага пакоя. Ма Чжун, склаўшы рукі на грудзях, стаў за яго спінай. Суддзя агледзеў старую пашараваную мэблю і патрэсканую тынкоўку на сценах і прамовіў:

— Матывам відавочна быў не рабунак.

— Вось ён, пане, матыў! — прысвіснуў Ма Чжун. — Стары муж, прыгожая маладая жонка — а што было далей, зразумела!

Суддзя Дзі азірнуўся і ўбачыў у дзвярах стройную жанчыну гадоў дваццаці пяці. Яе твар быў не нафарбаваны, а на шчоках заўважаліся сляды слёз. Аднак яе вялікія вільготныя вочы, вытанчана выгнутыя бровы, поўныя чырвоныя вусны і гладкая скура рабілі яе вельмі прывабнай. На ёй было блакітнае ўбранне, якое не хавала цудоўнай фігуры. Спалохана зірнуўшы на суддзю, жанчына пакланілася і застыла, апусціўшы вочы і пачціва чакаючы, калі той да яе звернецца.

— Мне вельмі шкада, пані, — мяккім голасам пачаў суддзя Дзі, — што я мушу патрывожыць вас адразу пасля трагедыі. Аднак спадзяюся, вы разумееце, што мне трэба дзейнічаць хутка, каб прыцягнуць нягоднага злачынцу да адказнасці.

Жанчына кіўнула, і суддзя прадоўжыў:

— Калі вы апошні раз бачылі свайго мужа?

— Мы елі ў гэтым пакоі наш вечаровы рыс, — мяккім меладычным голасам адказала пані Мэн. — Пасля, калі я прыбрала са стала, муж некалькі гадзінаў тут чытаў, а затым сказаў, што сёння вельмі прыгожая поўня, таму ён пойдзе ў садовы павільён і вып'е там некалькі кубкаў віна.

— Часта ён так рабіў?

— О, часта! Ён выходзіў у сад ледзь не кожны вечар, напяваючы сабе пад нос і радуючыся свежаму вечароваму ветру.

— Ён прымаў у такую пару гасцей?

— Ніколі, пане суддзя. Ён любіў заставацца на самоце і гасцей не ўхваляў. Тых некалькіх чалавек, што заходзілі да яго з візітам, ён заўсёды прымаў у гэтым пакоі ўдзень за кубкам гарбаты. Я так любіла гэтае мірнае жыццё, муж быў такі далікатны, ён… — на яе вачах з'явіліся слёзы, а вусны задрыжалі, аднак хутка яна ўзяла сябе ў рукі і прадоўжыла. — Я падрыхтавала вялікі збан віна і аднесла яго ў павільён. Муж сказаў, што чакаць яго не трэба, бо ён збіраецца заседзецца ў садзе дапазна. Таму я пайшла спаць. Раніцой у дзверы нашай спальні ліхаманкава пагрукаў слуга. Тады я заўважыла, што мужа побач няма. Хлопчык сказаў, што знайшоў у павільёне…

— Гэты хлопец жыве тут, у доме?

— Не, пане суддзя, ён начуе ў свайго бацькі, садоўніка, у самым вялікім доме Вярбовага квартала, а да нас прыходзіць толькі ўдзень. Пасля таго, як я прыгатую вечаровы рыс, ён вяртаецца да сябе.

— Ці чулі вы гэтай ноччу нешта незвычайнае?

Пані Мэн нахмурылася і адказала:

— Недзе адразу пасля поўначы я прачнулася, бо жабы ў ставе паднялі страшэнны галас. Удзень іх ніколі не пачуеш, бо яны сядзяць пад вадой. Яны маўчаць нават тады, калі я спускаюся да става нарваць лотасаў. Ноччу ж яны выпаўзаюць, і іх лёгка напалохаць. Таму я падумала, што муж, вяртаючыся ў дом, кінуў у стаў камень ці нешта яшчэ. На гэтым я заснула зноў.

— Зразумела, — прамовіў суддзя Дзі. Ён задумаўся, пагладжваючы доўгія бакенбарды: — На твары вашага мужа няма слядоў страху ці здзіўлення: ударылі яго, відаць, нечакана. Ён памёр, не паспеўшы зразумець, што яго забіваюць. Гэта даказвае, што ён добра ведаў злачынцу — мусіць, яны разам пілі ў павільёне віно. Вялікі збан быў амаль пусты, але каля яго стаяў толькі адзін кубак. Як я разумею, праверыць, ці не знік яшчэ адзін кубак, будзе складана?

— Зусім не складана, — адказала пані Мэн з лёгкай усмешкай. — У нас усяго сем кубкаў, шэсць з зялёнай парцаляны і адзін асобны вялікі кубак з парцаляны белай — з яго ўвесь час піў муж.

Суддзя падняў бровы: знойдзены ім кубак быў зялёны.

— У вашага мужа былі ворагі?

— Ніякіх, пане суддзя! — усклікнула жанчына. — Я не магу ўявіць, хто мог бы…

— А ў вас? — перарваў яе суддзя Дзі.

Яна пачырванела і прыкусіла губу. Потым вінавата прамовіла:

— Пан суддзя, безумоўна, ведае, што яшчэ год таму я працавала ў суседнім квартале. Часам мне даводзілася адмаўляць тым, хто шукаў маёй прыхільнасці, але я ўпэўненая, што ніводны з іх… Столькі часу прайшло…

Жанчына заціхла. Суддзя падняўся, падзякаваў пані Мэн, выказаў ёй спачуванне і пакінуў дом.

Калі двое мужчынаў спускаліся садовай дарожкай, Ма Чжун сказаў:

— Пану варта было спытаць таксама пра яе сяброў!

— Гэтыя звесткі я разлічваю атрымаць з тваёй дапамогай, Ма Чжун. Ты ўсё яшчэ сустракаешся з той дзяўчынай з квартала — здаецца, яе клічуць Кветка Яблыні?

— Кветка Персіка, пане. Канечне, сустракаюся!

— Добра. Вось і ідзі да яе цяпер, хай яна раскажа табе ўсё, што ведае пра пані Мэн з тых часоў, калі тая яшчэ з імі працавала. Асабліва пра мужчынаў, з якімі яна стасавалася.

— Але пакуль яшчэ так рана, пане, — з сумневам прагаварыў Ма Чжун. — Яна, мабыць, яшчэ спіць.

— Ну дык разбудзі яе! Давай ідзі!

З сумным выглядам Ма Чжун паспяшаўся да брамы. Суддзя Дзі лянотна падумаў, што калі часцей адпраўляць свайго шчодралюбнага памочніка дапытваць каханак яшчэ да сняданка, ад слабасці да жанчын ён хутка вылечыцца. Пасля бурнай ночы такія паненкі звычайна выглядаюць не вельмі прывабна.

Каля лотасавага става Юань Кай горача абмяркоўваў нешта з новапрыбылым — высокім, акуратна апранутым мужчынам з цяжкім падбароддзем і ўрачыстым выразам твару. Аптэкар прадставіў яго як пана Вэня Шу-фана, новага старшыню гільдыі гандляроў гарбатай. Старшыня нізка пакланіўся і рассыпаўся ў вытанчаных выбачэннях, што дагэтуль не прадставіўся чыноўніку. Суддзя Дзі рэзка яго перапыніў:

— Што прывяло вас сюды ў такі ранні час, пане Вэнь?

Пытанне, здавалася, захапіла Вэня знянацку.

— Я… я збіраўся выказаць свае спачуванні пані Мэн… — запінаючыся, прамармытаў ён. — Спытаць, ці магу я чым-небудзь ёй дапамагчы…

— Дык вы добра ведаеце іх сям'ю? — пацікавіўся суддзя Дзі.

— Акурат пра гэта, пане, мы з сябрам Вэнем толькі што і гаварылі, — паспешліва ўмяшаўся Юань Кай. — Мы з Вэнем вырашылі, не адкладаючы, прызнацца, што мы абодва шукалі прыхільнасці пані Мэн, калі яна была куртызанкай, і што абодва пацярпелі паразу. Мы абодва хочам засведчыць сваё поўнае разуменне таго, што куртызанка вольная прымаць альбо адхіляць заляцанні, і паведаміць, што ніхто з нас злосці на яе не таіў, а таксама што мы глыбока паважалі Мэна Ланя і былі вельмі рады, што яго шлюб аказаўся шчаслівым. Такім чынам…

— Пераходзьце да справы, — перарваў яго суддзя. — Спадзяюся, вы абодва можаце даказаць, што мінулай ноччу не былі дзесьці ў гэтых ваколіцах?

Аптэкар збянтэжана паглядзеў на сябра. Вэнь Шу-фан няўпэўнена адказаў:

— Ну, насамрэч, пане суддзя, мінулай ноччу мы абодва балявалі ў самым вялікім доме Вярбовага квартала. Затым мы… хм… падняліся наверх… хм… у прыемнай кампаніі… Вярнуліся дадому далёка за поўнач.

— Дома я трошкі падрамаў, — дадаў Юань Кай, — пасля пераапрануўся ў паляўнічы касцюм і адправіўся да будынка суда, каб суправаджаць пана ў паляванні на качак.

— Зразумела, — сказаў суддзя Дзі. — Добра, што вы сказалі, гэта пазбавіла мяне лішняй працы.

— Лотасавы стаў сапраўды вельмі прыгожы, — з палёгкай прамовіў Вэнь. Праводзячы суддзю да брамы, ён дадаў: — Як шкада, што ў такіх вадаёмах зазвычай поўна жаб.

— Часам ад іх такі страшэнны галас, — зазначыў Юань Кай, адчыняючы перад суддзём Дзі веснічкі.

Чыноўнік ускочыў на каня і паскакаў назад да суда.

Начальнік варты выйшаў на двор, каб сустрэць яго і паведаміць, што ў бакавым памяшканні ўсё гатовае для анатамавання. Спачатку суддзя Дзі адправіўся ў свой кабінет. Пакуль пісар наліваў яму кубак гарачай гарбаты, суддзя напісаў Ма Чжуну цыдулку, дзе наказаў апытаць куртызанак, з якімі Юань Кай і Вэнь Шу-фан прабавілі мінулую ноч. На хвілінку задумаўшыся, ён дадаў: «Правер таксама, ці начаваў слуга Мэнаў у доме свайго бацькі». Запячатаўшы пасланне, суддзя загадаў пісару неадкладна даставіць яго Ма Чжуну. Потым імкліва праглынуў некалькі сухіх праснакоў і пайшоў у бакавое памяшканне, дзе яго ўжо чакалі следчы і два памочнікі.

Нічога новага анатамаванне не прынесла: паэт вылучаўся добрым здароўем, прычына смерці — удар кінжалам у сэрца. Суддзя загадаў начальніку варты перанесці цела ў часовую труну, пакуль пытанне пра час і месца пахавання не вырашанае. Тады вярнуўся ў свой кабінет і разам са старэйшым пісарам засеў за афіцыйныя паперы, якія ўжо паспелі прыйсці.

Ма Чжун вярнуўся амаль апоўдні. Калі суддзя адаслаў пісара, Ма Чжун сеў насупраць чыноўніка і з самазадаволенай усмешкай пачаў:

— Кветка Персіка ўжо была не ў ложку, пане! Калі я пастукаўся, яна акурат займалася туалетам. Учора ў яе быў выходны, а таму яна рана легла спаць. Яна выглядала яшчэ прывабнейшай, чым звычайна, і я…

— Так-так, пераходзь да справы! — раздражнёна перапыніў Ма Чжуна суддзя, бо яго стратэгія відавочна цярпела паразу. — Яна, відаць, столькі табе ўсяго расказала, калі ты адсутнічаў амаль увесь ранак!

Ма Чжун зірнуў на суддзю з дакорам і шчыра адказаў:

— З такімі дзяўчатамі, пане, трэба асцярожна. Мы разам паснедалі, і я незаўважна падвёў размову да пані Мэн. У тыя часы яе называлі Агат, а яе сапраўднае імя — Шы Мэй-лань. Яна дачка селяніна з поўначы. Тры гады таму была вялікая суша і голад, людзі паміралі, як пацукі, і бацька прадаў яе зводніку, а той перапрадаў у дом, дзе і працуе Кветка Персіка. Агат была мілай і вясёлай дзяўчынай. Гаспадар дома пацвердзіў, што яе прыхільнасці шукаў Юань Кай і што яна яму адмовіла. Ён лічыць, што Агат проста падвышала сабе цану, бо калі аптэкар адступіўся і знайшоў сабе іншую сяброўку, яна выглядала расстроенай. З Вэнь Шу-фанам усё было трошкі інакш. Калі Агат не звярнула ўвагі на яго спробы завязаць стасункі, ён таксама не стаў настойваць, аднак застаўся яе прыхільнікам. Калі з ёй пазнаёміўся Мэн Лань, ён тут жа яе выкупіў. Але Кветка Персіка лічыць, што Вэнь дагэтуль кахае пані Мэн, бо часта гаворыць пра яе з іншымі дзяўчатамі і нядаўна сказаў, што тая заслугоўвае лепшага мужа, чым стары сварлівы рыфмач. Таксама я даведаўся, што ў Агат ёсць малодшы брат на імя Шы Мін і што ён сапраўдны шалапут. Гэты п'яніца і гулец прыцягнуўся за сястрой сюды і жыў за яе кошт. Недзе год таму, акурат перад жаніцьбай Мэна Ланя, ён знік. На мінулым тыдні нечакана аб'явіўся ў квартале зноў і пачаў распытваць пра сястру. Калі гаспадар сказаў, што Мэн Лань выкупіў яе і ажаніўся, Шы Мін адразу ж адправіўся да іх дома. Пазней слуга Мэна расказаў, што Шы Мін пасварыўся з паэтам, наконт чаго, слуга не ведае, але здагадваецца, што праблема тычылася грошай. Пані Мэн горка плакала, а Шы Мін пакінуў іх раз'юшаны. З таго часу ніхто яго не бачыў.

Ма Чжун замаўчаў, але суддзя Дзі ніяк на яго аповед не адрэагаваў. Ён марудна папіваў гарбату, нахмурыўшы свае кусцістыя бровы. Раптам ён спытаў:

— Слуга Мэнаў мінулай ноччу выходзіў?

— Не, пане. Я распытаў яго бацьку, старога садоўніка, і суседзяў. Юнак вярнуўся дадому адразу пасля вячэры, лёг у ложак, дзе спіць разам з двума братамі, і прахроп да світання. Дарэчы, пан жа даў мне яшчэ адзін загад. Дык вось, я даведаўся, што мінулую ноч Юань Кай правёў з Півоняй, сяброўкай Кветкі Персіка. Апоўначы яны падняліся ў яе пакой, а праз дзве гадзіны Юань пакінуў дом — пехам, бо збіраўся палюбавацца месяцавым святлом. Вэнь Шу-фан застаўся з дзяўчынай на імя Гваздзік, вельмі прыемнай куртызаначкай, хаця сёння ранкам настрой у яе быў змрачнаваты. Вэнь, відаць, у той вечар перапіў і, дайшоўшы да пакоя сваёй сяброўкі, тут жа заваліўся на ложак і адключыўся. Зрабіўшы некалькі марных спробаў яго абудзіць, Гваздзік адправілася ў суседні пакой, дзе загулялася з іншымі дзяўчатамі ў карты і начыста пра яго забыла. Праз тры гадзіны Вэнь апрытомнеў, але на вялікае расчараванне Гваздзіка ў яго было такое страшнае пахмелле, што ён адразу адправіўся дадому, таксама пехам. Ён сказаў, што хоча прагуляцца, а не ехаць у паланкіне, спадзеючыся, што свежае паветра асвяжыць яму мазгі. Вось, пане, і ўсё. Думаю, наш чалавек — Шы Мін. Ажаніўшыся з яго сястрой, Мэн Лань адабраў у яго, так бы мовіць, місу з рысам. Сказаць начальніку варты, каб пачаў шукаць Шы Міна? У мяне ёсць добрае апісанне.

— Займіся гэтым, — адгукнуўся суддзя Дзі. — Потым можаш пайсці з'есці свой паўдзённы рыс, да вечару ты мне не спатрэбішся.

на лотасавым ставе

— Тады я трошкі пасплю, — задаволена сказаў Ма Чжун. — Гэтым ранкам мне давялося папрацаваць — спачатку паляванне на качак, потым усё астатняе.

— Не сумняюся! — суха адказаў суддзя.

Калі Ма Чжун сышоў, суддзя Дзі падняўся на мармуровую тэрасу, з якой было добра бачнае возера. Ён сеў у вялікае крэсла і з'еў прынесены яму сюды паўдзённы рыс. Вяртацца ў свае пакоі, размешчаныя на другім баку суда, яму не хацелася: усе яго думкі былі так занятыя забойствам, што ён не атрымаў бы асалоды ад сустрэчы з сям'ёй. Скончыўшы есці, ён перасунуў крэсла ў цяністы кут. Але толькі ён падрыхтаваўся трошкі падрамаць, як на тэрасу ўвайшоў пасланнік і прынёс яму справаздачу ад радцы Хуна. Радца пісаў пра расследаванне ў заходняй частцы акругі, якое паказала, што на скарбовага пасланца напала хеўра з шасці нягоднікаў. Збіўшы няшчаснага да непрытомнасці, яны забралі пакунак з залатымі зліткамі і спакойна адправіліся ў памежную карчму, дзе добра пад'елі. Потым да іх прыехаў незнаёмец, рот і нос якога былі схаваныя шыйнай хусткай і якога ў карчме ніколі раней не бачылі. Верхавод хеўры перадаў яму пакунак, пасля чаго яны ўсе зніклі ў лясах суседняй акругі. Пазней цела незнаёмца было знойдзенае ў канаве непадалёк ад карчмы. Апазналі яго па адзенні, бо твар забітага ператварыўся ў бясформеннае месіва. Мясцовы следчы аказаўся чалавекам дасведчаным: ён разгледзеў змесціва страўніка мерцвяка і знайшоў там сляды моцнага зелля. Пакунак з золатам, зразумела, знік. «Такім чынам, нападзенне на скарбовага пасланца было старанна спланаванае, — зрабіў у канцы выснову радца, — прычым чалавекам, пра якога мы нічога не ведаем. Яго суўдзельнік наняў дзеля бруднай працы бандытаў, а потым адправіўся ў карчму забраць здабычу. Сам жа незнаёмец пайшоў за сваім памочнікам, збіў яго да смерці, ці то каб пазбавіцца ад магчымага сведкі, ці то таму, што не захацеў выплаціць яму належную долю. Каб узяць след злачынцы, мы вымушаныя прасіць падтрымкі ў суддзі суседняй акругі. Я пачціва прашу пана суддзю прыбыць сюды і персанальна ўзначаліць расследаванне».

Суддзя Дзі марудна скруціў пасланне. Радца Хун мае рацыю, трэба неадкладна ехаць туды. Аднак забойства паэта таксама патрабуе ўвагі. І Юань Кай, і Вэнь Шу-фан мелі магчымасць забіць, але ў іх, здаецца, няма матыву. У брата пані Мэн матыў ёсць, але калі гэта справа яго рук, ён, несумненна, паспеў ужо збегчы. Суддзя ўздыхнуў, адкінуўся на спінку крэсла, задуменна пагладжваючы сваю бараду, і не заўважыў, як амаль адразу заснуў.

Прачнуўшыся, ён з прыкрасцю зразумеў, што спаў занадта доўга, — ужо змяркалася. Ля балюстрады стаялі Ма Чжун і

начальнік варты. Апошні паведаміў, што на пошук Шы Міна кінутыя ўсе сілы, але пакуль ніякіх слядоў не знойдзена.

Суддзя Дзі перадаў Ма Чжуну пасланне радцы:

— Уважліва прачытай гэты ліст, а потым займіся падрыхтоўкай да паездкі на заходнюю мяжу акругі — заўтра раніцай мы туды выязджаем. Са сталічнай скарбніцы прыйшоў загад неадкладна паведаміць пра абрабаванне. Яны начэй не спяць праз зніклую звязку медзякоў, а тут — цэлы тузін залатых зліткаў!

Суддзя спусціўся ў свой кабінет і накідаў чарнавы варыянт справаздачы ў скарбніцу. Потым з'еў вячэру, накрытую тут жа на яго стале. Смаку ежы ён амаль не адчуў, бо яго думкі луналі зусім у іншым месцы. Адклаўшы палачкі, ён з уздыхам падумаў пра два гэтыя няшчасныя злачынствы, якія здарыліся ледзь не ў той самы час. Раптам ён адставіў гарбату, падняўся і пачаў мераць крокамі пакой. Яму здалося, што ён зразумеў прычыну знікнення кубка для віна. Трэба гэта як мага хутчэй праверыць. Суддзя падышоў да акна і вызірнуў на двор. Убачыўшы, што там нікога няма, ён імкліва праскочыў да бакавой брамы і незаўважна пакінуў суд.

На вуліцы ён схаваў шыйнай хусткай ніжнюю частку твару і наняў на рагу маленькі паланкін. Перад уваходам у самы вялікі дом Вярбовага квартала ён расплаціўся з насільшчыкамі. З ярка асветленых вокнаў невыразна даносіліся спевы і смех: вясёлая бяседа была, відавочна, у разгары. Суддзя Дзі паспяшаўся да сцяжынкі, што вяла да дома Мэна Ланя.

Падыходзячы да садовай брамы, ён заўважыў, якая вакол цішыня. З-за дрэваў сюды з Вярбовага квартала не даносілася ні гуку. Суддзя мякка адчыніў веснічкі і агледзеў сад. На лотасавы стаў падала месяцавае святло, але дом на задворках стаяў у поўнай цемры. Суддзя абышоў вакол вадаёма, потым спыніўся, падняў камень і кінуў яго ў стаў. У гэты ж момант жабы хорам заквакалі. Задаволена ўсміхаючыся, суддзя Дзі скіраваўся да дзвярэй, зноў насунуўшы на твар шыйную хустку. Схаваўшыся ў ценю ганка, ён пагрукаў.

У акне загарэлася святло. Дзверы адчыніліся, і з-за іх пачуўся шэпт пані Мэн: «Уваходзь хутчэй!»

Яна стаяла ў дзвярным праёме напалову аголеная: на ёй была толькі тонкая набедраная павязка, а валасы свабодна падалі на плечы. Калі суддзя апусціў шыйную хустку, з яе грудзей вырваўся здушаны крык.

— Я не той, каго вы так чакалі, — холадна прамовіў суддзя, — але мне ў любым выпадку давядзецца зайсці.

Ён зрабіў крок у пакой, зачыніў за сабой дзверы і строга спытаў у скурчанай жанчыны:

— Каго вы чакаеце?

Яе вусны варухнуліся, але з іх не вырвалася ні гуку.

— Кажыце! — раўнуў суддзя.

Камечачы на таліі набедраную павязку, яна з запінкамі адказала:

— Я нікога не чакала. Мяне абудзіў шум жаб, і я спалохалася, што нехта да нас прабраўся. Таму я вырашыла зірнуць…

— І запрасіць рабаўніка хутчэй зайсці ў пакой! Калі ўжо вы збіраецеся маніць, прыдумайце нешта разумнейшае! Пакажыце мне спальню, дзе вы чакаеце каханка!

Жанчына бязгучна ўзяла са стала свечку і павяла суддзю ў маленькі бакавы пакойчык, дзе стаяў толькі вузкі дашчаны ложак, пакрыты тонкай трысняговай цыноўкай. Суддзя падскочыў да ложка і абмацаў яго. Цыноўка ўсё яшчэ захоўвала цеплыню яе цела.

— Вы заўсёды тут спіце? — рэзка спытаў ён.

— Не, пане суддзя, гэта пакой нашага слугі — хлопец дрэмле тут пасля абеду. Мая спальня — па другі бок ад залы, якую мы толькі што мінулі.

— Адвядзіце мяне туды!

Калі яна перасекла залу і ўвяла суддзю ў вялікую спальню, той забраў у жанчыны свечку і хутка агледзеў пакой. Тут стаялі чатыры адзежныя скрыні, туалетны столік з бамбукавым крэслам і вялікі ложак. Суддзя адшмаргнуў балдахін і ўбачыў, што тоўстая цыноўка з мяккага трыснягу скручаная, а падушкі прыбраныя ў сценную нішу. Суддзя павярнуўся да пані Мэн і злосна спытаў:

— Мяне не цікавіць, дзе вы збіраліся са сваім каханкам спаць, я хачу ведаць яго імя. Кажыце!

Жанчына прамаўчала і толькі кінула на яго касы погляд. У гэты момант яе набедраная павязка саслізнула на падлогу, і пані Мэн стала перад ім зусім аголеная. Прыкрываючыся рукамі, яна зноў сарамліва зірнула на суддзю.

Суддзя Дзі адвярнуўся.

— Гэтыя жарцікі мне надакучылі, — холадна сказаў ён. — Апранайцеся, вы пойдзеце са мной у суд і праведзяце ноч за кратамі. Заўтра я вас дапытаю, калі спатрэбіцца, пад катаваннямі.

Яна маўкліва адчыніла адзежную скрыню і пачала апранацца. Суддзя выйшаў у залу і там прысеў. Ён падумаў, што жанчына зайшла занадта далёка, каб уратаваць свайго каханка, і пацiснуў плячыма. Хаця калі ўлічыць, што яна былая куртызанка, то не так ужо гэта і далёка. Калі яна, цалкам апранутая, выйшла ў залу, суддзя знакам паказаў ёй ісці за ім.

Ля ўваходу ў Вярбовы квартал яны сустрэлі начную варту. Суддзя загадаў начальніку адправіць пані Мэн у паланкіне ў суд і перадаць там яе наглядчыку турмы. Яшчэ чатырох чалавек трэба было выслаць у дом забітага паэта — яны мусілі схавацца ў зале і арыштаваць любога, хто пагрукае ў дзверы. Сам суддзя, глыбока задумаўшыся, няспешна пакрочыў дадому.

Увайшоўшы ў браму суда, суддзя Дзі ўбачыў Ма Чжуна, які ў вартавым памяшканні гамaніў з салдатамі. Суддзя забраў памочніка ў свой кабінет, дзе расказаў яму пра здарэнне ў доме паэта. Ма Чжун сумна пахітаў галавой:

— Значыць, у яе быў таемны каханак, які і забіў паэта. Што ж, выглядае на тое, што справа амаль закрытая. Думаю, мы пераканаем яе назваць імя таго хлопца.

Суддзя Дзі глытнуў гарбаты і марудна прагаварыў:

— У гэтай справе ёсць некалькі момантаў, якія моцна мяне турбуюць. Я адчуваю, што паміж забойствам Мэна і нападам на скарбовага пасланца ёсць нейкая сувязь, але якая — нават не ўяўляю. Дарэчы, мне цікавае тваё меркаванне па двух пытаннях. Па-першае, як пані Мэн магла завязаць таемную інтрыжку? Яны з мужам амаль нікуды не выходзілі і гасцей прымалі вельмі рэдка. Па-другое, я ўпэўніўся, што сёння ноччу яна спала ў пакоі слугі на вузкім дашчаным лежаку. Чаму яна не захацела прыняць каханка ў спальні на зручным і шырокім ложку? Пашана да мёртвага мужа яе б не спыніла, калі ўжо яна спакойна круціла раман за яго спінай. Я, канечне, разумею, што зручнасць каханкаў не вельмі хвалюе, але ўсё адно — жорсткі, вузкі ляжак…

— Ну, што да першага пытання, — ухмыльнуўшыся, пачаў Ма Чжун, — калі жанчына вырашыла з кімсьці закруціць, не сумнявайцеся, спосаб для гэтага яна знойдзе. Напрыклад, яе каханкам мог зрабіцца слуга, і тады яе грашкі ніяк з забойствам не звязаныя. Наконт другога ж пытання магу сказаць толькі тое, што сам я нямала паспаў на дашчаных лежаках, і мне ніколі не прыходзіла ў галаву думка з кімсьці іх дзяліць. Аднак я з усёй ахвотай гатовы адправіцца ў Вярбовы квартал і правесці грунтоўнае даследаванне ўсіх звязаных з гэтым пытаннем акалічнасцяў.

З гэтымі словамі Ма Чжун з надзеяй зірнуў на суддзю.

Суддзя Дзі ўтаропіўся ў памочніка, але думкамі быў недзе далёка. Паволі патузваючы сябе за вус, ён некаторы час маўчаў, але раптам усміхнуўся і сказаў:

— Так, гэта варта паспрабаваць.

Твар Ма Чжуна заззяў, але радасць яго была дачаснай, бо суддзя тут жа дадаў:

— Зараз жа бяжы ў карчму «Чырвоны карп», што за рыбным рынкам. Знайдзі там старшыню гільдыі жабракоў і скажы яму адправіць з табой некалькі пабірахаў, што бадзяюцца ў ваколіцах Вярбовага квартала. Усю гэтую хеўру вядзі да мяне, а старшыні іх перадай, што мне трэба дапытаць іх з нагоды новых звестак, якія праліваюць святло на забойства паэта Мэна Ланя. Не рабі з гэтага таямніцы, наадварот — зрабі так, каб усе ведалі, навошта мне спатрэбіліся жабракі. А цяпер ідзі!

Ма Чжун не варухнуўся з месца, ашаломлена гледзячы на суддзю, і той дадаў:

— Калі мой план спрацуе, я развяжу адным махам і забойства Мэна, і крадзеж залатых зліткаў. Таму пастарайся!

Ма Чжун падняўся і паспяшаўся вонкі.

Калі Ма Чжун вярнуўся ў кабінет суддзі, ведучы за сабой чатырох абадранцаў, ён убачыў, што на бакавым стале стаяць сподкі з пірагамі і цукатамі, а таксама некалькі збаноў віна.

Працяг на стар. 14 (8).

Працяг.
Пачатак на стар. 11–13 (5–7).

Суддзя Дзі па-сяброўску прывітаў спалоханых жабракоў, спрабуючы іх супакоіць, і запрасіў частавацца ежай і віном. Калі здзіўленыя пабірахі няўпэўнена падышлі да стала, не зводзячы галодных вачэй з ласункаў, суддзя адвёў Ма Чжуна ўбок і прашаптаў:

— Ідзі ў вартавое памяшканне і выберы сярод варты траіх добрых хлопцаў. Потым чакай з імі ля брамы. Недзе праз гадзіну я адпушчу жабракоў, і трэба, каб вы за імі таемна прасачылі. Арыштоўвайце кожнага, хто звернецца да любога з іх, і потым вядзіце яго сюды разам з жабраком.

Потым ён павярнуўся да абадранцаў і заахвоціў іх налягаць на ежу і віно. Збянтэжаныя жабракі доўга ваганіся, але ўзяўшыся ўрэшце за страву, з неверагоднай хуткасцю апустошылі талеркі і кубкі. Іх старшыня, аднавокі нягоднік, выцер рукі аб сваю зашмальцаваную бараду і пакорліва прамармытаў:

— А зараз ён адсячэ нам галовы. Што ж, прынамсі, апошняя жратва была шыкоўная.

На яго здзіўленне суддзя запрасіў іх прысесці на лавачкі перад сваім сталом. У кожнага з жабракоў ён спытаў пра ўзрост, сям'ю, пра тое, адкуль ён родам, а таксама многія іншыя нявінныя дробязі. Калі жабракі зразумелі, што ніякіх непрыемных тэмаў суддзя кранаць не збіраецца, яны пачуліся больш свабодна, і гадзіна за размовамі праляцела вельмі хутка.

Урэшце суддзя Дзі падняўся, падзякаваў ім за дапамогу і дазволіў пайсці. Потым ён склаў за спінай рукі і пачаў мераць крокамі пакой.

Грукат у дзверы пачуўся яшчэ раней, чым ён чакаў. У кабінет увайшоў Ма Чжун, цягнучы за сабой аднавокага старшыню.

— Ён сунуў мне гэтую срэбную манету яшчэ да таго, як я паспеў нешта ўцяміць, пане суддзя! — плакаўся стары жабрак. — Клянуся, што я не лез у яго кішэню!

— Я ведаю, што не лез, — сказаў суддзя Дзі. — Не хвалюйся, манету можаш пакінуць сабе. Проста раскажы мне, што ён табе сказаў.

— Ён падышоў да мяне, як толькі я завярнуў за рог, пане суддзя, і сунуў у руку манету. Затым сказаў: «Хадзем са мной, і я дам табе другую, калі ты раскажаш, пра што суддзя пытаў у цябе і тваіх сяброў». Клянуся, гэта праўда, пане суддзя!

— Цудоўна! Можаш цяпер ісці. Але не мантач грошы на віно і гульні! — як толькі жабрак выскачыў з кабінета, суддзя павярнуўся да Ма Чжуна: — Вядзі сюды арыштаванага!

Увайшоўшы ў пакой, аптэкар Юань Кай пачаў гучна абурацца:

— Паважнага гараджаніна арыштоўваюць як звычайнага злачынцу! Я хачу ведаць...

— А я хачу ведаць, — холадна перапыніў яго суддзя Дзі, — навошта вы чакалі гэтага жабрака і навошта хацелі яго распытаць.

— Канечне ж, таму, што я цікаўлюся расследаваннем, пане суддзя! Мне вельмі хацелася ведаць...

— Ці знайшоў я ключ, які ўказвае на вас і які вы прагледзелі! — скончыў за яго суддзя Дзі. — Юань Кай, вы забілі паэта Мэна Ланя, а таксама Шы Міна, праз якога вы звязаліся з рабаўнікамі, што напалі на скарбовага пасланца. Прызнавайце сваю віну!

Юань Кай паблядне́ў, аднак цвёрдым і рашучым голасам спытаў:

— Спадзяюся, у пана суддзі ёсць сур'ёзныя падставы для такіх важкіх абвінавачванняў.

— Ёсць. Пані Мэн засведчыла, што ў іх ніколі не бывала начных наведнікаў. Таксама яна засведчыла, што цягам дня жабы ў лотасавым ставе ніколі не квакаюць. І ўсё ж вы гаварылі пра шум, які яны ствараюць. Гэта значыць, што вы бывалі ля таго става ўначы. Далей, Мэн піў віно са сваім забойцам, які пакінуў свой кубак на стале, але забраў кубак Мэна. Гэта разам са спакойным тварам Мэна падказала мне, што яго, перш чым забіць, апаілі нейкім зеллем. Забойца забраў кубак ахвяры, бо баяўся, што на ім застанецца пах зелля, нават калі яго вымыць у ставе. Суўдзельніка злачынцы, які спланаваў напад на скарбовага пасланца, таксама чымсьці напаілі. Адсюль можна зрабіць выснову, што абодва злачынствы здзейсненыя адным чалавекам. Гэта прымусіла мяне западозрыць вас, бо вы як аптэкар добра ведаеце зеллі і атруты. Да таго ж вы мелі магчымасць забіць Мэна Ланя пасля таго, як сышлі з Вярбовага квартала. Мне прыгадваецца, што паляванне на качак нам сёння не ўдалося — мы нічога не ўпалявалі. Аднак гэта дзіўна: нашую сябрыну вёў такі ўмелы лавец, як вы. Вы былі ў кепскай форме, бо мелі перад гэтым напружаную ноч. Навучыўшы мяне лавіць качак з дапамогай прынады, вы падказалі мне добрую ідэю, як праверыць свае падазрэнні. Прынадай у нашым выпадку быў жабрак, і вы цудоўна на яго злавіліся.

— А як наконт матыву? — марудна прагаварыў Юань Кай.

— Некаторыя факты, якія вас не тычацца, падказалі мне, што пані Мэн чакала ўначы таемнага візіту свайго брата Шы Міна, і гэта даказвае, што яна ведала пра яго ўдзел у нейкім злачынстве. Калі Шы Мін наведаў сястру і яе мужа на мінулым тыдні і калі тыя адмовіліся даць яму грошай, ён раз'юшыўся і пахваліўся, што вы запрасілі яго паўдзельнічаць у справе, якая зробіць яго багатым. Мэн і яго жонка ведалі, што Шы Мін — чалавек нягодны, і таму, калі яны пачулі пра напад на скарбовага пасланца, а Шы Мін больш не з'явіўся, яны зразумелі, што акурат пра гэтую справу Шы Мін і гаварыў. Мэн Лань быў сумленным чалавекам і абвінаваціў вас у рабунку — вось і ваш матыў. Пані Мэн хацела ўратаваць брата, але як толькі яна даведаецца пра тое, што вы забілі і яго, і яе мужа, яна ўсё раскажа, і яе сведчанні завершаць справу супраць вас, Юань Кай.

Аптэкар, цяжка дыхаючы, апусціў галаву. Суддзя Дзі працягваў:

— Я мушу папрасіць прабачэння ў пані Мэн. Варты жалю род заняткаў, якім яна калісьці зарабляла на жыццё, не паўплываў на яе цвёрды характар. Яна шчыра любіла свайго мужа, і хаця ведала, што яе брат — нікчэмны чалавек, была гатовая вынесці лупцоўку за непавагу да суда, толькі б яго не выдаць. Што ж, хутка яна зробіцца багатай, бо палова вашай маёмасці пяройдзе да яе як выкуп за кроў мужа. І няма ніякіх сумневаў, што ў належны час Вэнь Шу-фан зробіць ёй прапанову, бо ён усё яшчэ глыбока яе кахае. Вам жа, Юань Кай, у адпаведнасці з законам адсякуць галаву як ганебнаму забойцу.

Раптам Юань падняў вочы і невыразным голасам сказаў:

— Гэта ўсё тая праклятая жаба! Я забіў яе і скінуў у стаў, ад чаго галас і падняўся, — і горка дадаў: — Якім я быў дурнем, думаючы, што жабы не умеюць гаварыць!

— Могуць, — спакойна прамовіў суддзя. — І калі трэба — гавораць.

Пераклала з ангельскай мовы
Ганна Янкута

Сад колеру мальвы

Ад сёлетняга сакавіка з ініцыятывы курсаў «Мова нанова» ў Мінску рэгулярна праводзяцца варштаты для тых, хто цікавіцца мастацкім перакладам. Паўтара дзясятка наведнікаў выконваюць творчыя заданні і робяць першыя крокі ў гэтым жанры літаратурнай творчасці. Некаторыя з іх ужо засведчылі свой неаматарскі ўзровень. Як прыклад можна прывесці апавяданне вядомага сербскага празаіка XX ст. Бранка Чопіча ў перастварэнні наведніцы варштатаў Алесі Птушкі, якое прапануем увазе чытачоў «Літаратурнай Беларусі».

Лявон Баршчэўскі, Зміцер Колас, вядоўцы курсаў

Бранка Чопіч (1915–1984), родам з Босніі, быў адным з самых вядомых празаікаў пасляваеннага пакалення Югаславіі. Аўтар раманаў «Прарыў», «Не сумуй, бронзавы вартавы», «Маўклівы порах», апавесцяў для дзяцей, апавяданняў.

Бранка ЧОПІЧ

Мужчыны звычайна кепска адрозніваюць колеры, але такога невука ў гэтым пытанні, якім быў мой дзед, цяжка было знайсці. Яго спектр зводзіўся ўсяго да чатырох асноўных колераў, а ўсе іншыя або не існавалі, або, калі дзед быў у гуморы, зводзіліся прынамсі да нейкага надта неакрэсленага апісання: «гэта жоўты, а нават калі і не жоўты, дык нейкі іншы — а можа, такога і няма».

А паколькі на нашым каляровым свеце большасць стварэнняў і прадметаў маюць афарбоўку «нейкага іншага колеру, якога можа і няма», то з маім дзедам у гэтай тэме заўсёды даходзіла да непаразуменняў і непрыемнасцяў.

У адну з найцудоўнейшых пор года амаль за адну ноч у садзе на рагу нашага дома заквітнела чорная мальва і прыгожа выглядала з-за спічастага, пачарнелага плоту. Спакойнымі, сонечнымі ранiцамі яна выпраменьвала такую таямнічасць і пяшчоту, што не магла не прыцягнуць увагу нават дзедавага вока, і ён задаволена бурчаў, ходзячы па двары:

— Паглядзіце на яе, увесь сад сінее колерам індыга.

Яно як бы сапраўды так, на кветках мальвы дзе-ндзе былі ледзь заўважныя сляды сінявага колеру, але калі дзед сказаў, што кветкі сінія, значыць, яны сінія і кропка. Такая ж сітуацыя магла паўтарыцца праз некалькі гадоў, і пра той жа сад дзед казаў, што ён чырванее, і цэлы год так яно і было: мальвы станавіліся чырвонымі.

Дзедаў стрыечны брат Сава Дам'янавіч, былы рабаўнік дробнай скаціны, а ў старасці — п'яніца ды казачнік, умеў ненаўмысна перабіваць майго цудоўнага дзеда. Пакуль дзед распавядае, ён здзіўлена тое ж самае перапытвае:

— Чаму ліса чырвоная, калі яна жоўтая!

— Хм, жоўтая? — заводзіцца дзед. — Нос у цябе жоўты.

Сава трывожна мацае свой ружовы нос-бульбіну і крыўдзіцца:

— Чырвоная! Усе народы адсюль і да Біхача ведаюць, што яна жоўтая, а ты...

Саваў свет заканчваецца ў Біхачы, бо некалькі разоў ён сядзеў там у турме, але нават такія прасторы не могуць перакانаць майго дзеда.

— Хм, да Біхача! Іншыя людзі таксама сядзелі ў біхацкай вежы, але ж яны не кажуць, што ліса жоўтая. Лепей во пі маю ракію і маўчы, не псуй мне ўнукаў.

А мы, трое ўнукаў, забіліся ў кут каля дзеда і чакаем, калі Сава пачне аповед пра свае зладзейскія прыгоды. Спрэчка аб колерах нас увогуле не цікавіць, бо ліса — гэта ліса, якога б колеру яна не была. З-за дзедавай упартасці ў пытанні колераў я і сам меў непрыемнасці, як толькі пераступіў парог дома.

Гэта было ў першым класе сярэдняй школы.

Недзе ў другой палове вучэбнага года настаўніца расказвала нам пра ваўка: дзе ён жыве, чым харчуецца і так далей, пакуль раптам не запыталася:

— Дзеці, а хто ведае, якога колеру воўк?

Я першы падняў руку.

— Вось, Бранка нам скажа.

— Воўк зялёны! — выдаў я ганарліва.

Настаўніца ўздрыгнула і здзіўлена ўзняла бровы.

— Бог з табой, дзіцятка, дзе ты такое пачуў?

— Так кажа мой дзед, — адказаў я ўпэўнена.

— Няправільна, воўк не зялёны.

— Усё правільна, ён зялёны! — нечакана абурыўся я як сапраўдны ўнук прыстойнага дзеда Радэ.

Настаўніца падышла да мяне зусім блізка, разглавана паглядзела на мой твар і пацягнула мяне за вуха.

— Скажы свайму разумнаму дзеду, што гэта няпраўда. Воўк шэры. Шэры, запомні.

Неўзабаве я ўвесь у слязах прыцягнуўся дамоў і, шморгаючы носам, расказаў дзеду пра ўсё, што здарылася ў школе.

Я і падумаць не мог, які вэрхал вакол гэтага ўзнімецца.

Што? Перад цэлым класам яго ўнука, улюбёнчыка, цягнуць за вушы, а паважанага старога чалавека абзываюць «разумным», то бок дурнем! Вось да чаго мы дажыліся! Ды яшчэ казаць, што воўк не зялёны, а нейкі там.... хм! Не, гэта так проста не пройдзе.

Назаўтра дзед, распалены, бы запечаны гусь, прыйшоў разам са мной у школьны двор і перад усёй дзятвою пачаў раўці на настаўніцу:

— Гэта ты, гарадская разумніца, такая і сякая, лепей за мяне ведаеш, як выглядае воўк, так? Не зялёны? Паглядзіце на яе! Я сярод ваўкоў нарадзіўся і вырас, за цэлае стагоддзе пуд солі з імі з'еў, а яна мне тут... Адлупцаваць бы цябе вось гэтым кіем, пакуль да розуму не вернешся.

Дзед ганьбіў яе, настаўніца расплакалася, а мы, вучні, з гэтага ўсяго мелі сваю радасць: у той дзень не было заняткаў.

Ужо наранíцу дзеда забралі жандары. Стары сем сутак адсядзеў на мясцовых нарах, а калі вярнуўся, пабялелы і маўклівы, то ўвечары прыгразіў мне пальцам:

— Ад цябе, даўгі язык, хай яшчэ толькі раз пачую мэканне пра тое, хто якога колеру, то табе пакажу. Воўк зялёны, ха! Якая табе розніца, які ён.

— Але ж яна ў мяне запыталася...

— Запыталася ў цябе, хм! Ты мусіў маўчаць — і кропка.

Наступнаю вясной, дзівоснай і дажджлівай, мальва ў нашым садзе расквітнела як ніколі раней, але стары быццам гэтага не заўважаў. Не дапамагла ў гэтым нават тарабаршчына нястомнага дзядзькі Савы, — дзед нібы сасле́п і што да колераў, і што да ўсіх кветак гэтага свету. Яго ахапіла туга.

З тых невясёлых дзён прайшло амаль паўстагоддзя, дзеда ўжо даўно няма на гэтым свеце, а я і да сёння дакладна не ведаю, якога колеру мальва. Ведаю толькі, што вясною з-за нашага пачарнелага плоту ў двары выглядае нешта такое прыгожае, лёгкае і светлае, што ты пачынаеш проста плакаць, хоць і не ведаеш, аб чым табе баліць і што ты страціў.

Пераклала з сербскай
Алеся Птушка

Рэха свінцовых маланак

Вершы і тэксты патрыятычнай генерацыі сучасных украінскіх творцаў, змешчаныя ў зборніку нацыяналістычнай паэзіі «Рэха свінцовых маланак» — адказ на русіфікацыю Украіны. Як піша ў прадмове да кнігі каардынатар і адзін з аўтараў зборніка Юрый Руф, «галоўная думка, якую аўтары намагаюцца данесці да чытача: неабходна шанаваць уласную мову і культуру, не шукаючы пракрокаў у чужой дзяржаве», вяртацца да гістарычных каранёў. Гэтага бракуе і нам, беларусам...

Юрый РУФ

Знакі на целе

Чорным па белым знакі на целе —
Руны агню і выявы багоў,
Вязь абярэгаў чарнiламі сцелюць
Спрытнымі рухамі рукі майстроў.

Сіла хаваецца ў перапляценнях,
Шчасце тваё абярэг той збярог.
Чорным па скуры знакі на целе —
Ты перасільваеш болю парог.

Сімвалы тыя, крывавыя знакі,
Верна цябе праз жыццё павядуць,
Стрэл Перуновы і злосць ваўкалакаў
Ад рознага ліха нас зберагуць.

Кніга адкрытая — знакі на целе,
Ты прачытаеш там сэнсы быцця,
Згадку пра тое, што ўславіць хацелі
І перанесці праз рэчку жыцця.

Добраахвотнікі Божага ўзводу

Ахалоджвае далоні аўтамат,
І сухія твары пылам стэп закурыць.
Час дажджоў змяняецца на град,
А са спелым коласам палі —
на снег-віхуры.

Замест звыклае канапы — бліндажы,
Замест даху — капюшон
і плашч-палатка,
Паміж світу мінаў зноўку віражы
І рубцы ад ран — да скону будуць згадкай.

Валанцёры ўзводу Божага яны —
Толькі цьмяны бляск вачэй
з-пад балаклавы.
На мяжы святла і цемрыні —
Батальён дабра на варце стаў
Дзяржавы.

Алхімія вайны

Ператвараецца тут золата на медзь
калібру 7,62.
Гарыць тут тое, што не мусіла гарэць —
і словы, і трава.
Свінец пераплаўляецца на кроў,
цячэ, бы ртуць.
Нянавісцю гартуецца любоў —
вятры пякуць.
Алхімія вайны шукае змест і ў чым жыццё,
У печах разбухтораных стыхій
гарыць быццё.
Стары алхімік ісціну шукаў,
ды не знайшоў,
і ўсё, што ёсць, ён у адно змяшаў
і — вось — пайшоў.

Нябесны легіён

Ольбегу Рарогу

Слязьмі крыві пакроплены бялюткі снег —
Рудыя плямы мерзлых душ у зімным полі.

Тут бой адбыўся, і ніхто адсюль не збег,
Адзін за ўсіх і ўсе мы за Жыццё і Волю.

Ляцела хваляю нястрымнаю арда,
Жадала смерцю ўсеяць нашы стэпы —
Прыйшла з масквы ад дыму п'янай
злыбяда,
Бажочак блаславіў «духоўныя іх скрэпы».

І снег цямнеў, чарнела ў небе муць,
Грымелі крумкачовых зграяў песні...
Валькірыі да Белых Вежаў аднясуць
Героя, што ўступілі ў легіён Нябесны.

Ігар БАЙЧУК

Кроў на вугалях

Даўно ўзарваныя дарогі і масты,
Жыццё скарылася ў абдымках долі.
Акружаныя шчыльна блокпасты
Стаяць да перамогі і за волю.

Страляе ў далеч малады салдат,
Трымае зброю за сваю краіну.
Сціскаюць рукі цвёрда аўтамат,
Ды смерць-драпежніца нацэлілася ў спіну.

Пякельны час, паўсюль пякельны жах —
Зямля гарыць ад залпаў і агнёў.
Кроў чырванее ў чорных вугалях,
Асвечаная ў полымі баёў.

Да неба рукі ўзвядзі

Да неба рукі ўзвядзі!
Праведны шлях таруй.
Моцу вагню і вады
Целам сваім адчуй.

Згадай былыя часы,
Слаўных воінаў дух,
Ахвяру багам нясі
У чысты, зялёны луг.

Сябе разняволь, развяжы,
Даверся буйным вятрам.
Прыроды красу беражы,
Прырода — адзіны храм.

Маліцца сабе дазволь,
Сэрцам сваім шчыруй.
Помсці за крыўды і боль,
Ворагу — не даруй.

Законам роду жыві,
Працуй, каб пот па ілбе
Спадаў, як раса з травы.
І будзь заўжды пры сяўбе.

Берагіня роду

Будучыня нацыі —
у руках маці.
Анарэ дэ Бальзак

Родная, каханая, роду берагіня,
Верная заўжды і поруч кожны час.
Цеплыні сямейнай, любасці багіня,
Нібы сонца — грэеш, ззяеш, як — алмаз.

Цеплыня крыві тваёй і пяшчота цела,
Што гарыць агнём у хвілі асалод.
Сэрца тваё птушачкай спуджанай
трымцела
У часы расстання, страху і нягод.

Твае бездань-вочы, нібы дзве крыніцы —
Іхні бляск чаруе, раніць, бы пчала,
І твой грозны позірк мацеркі-ваўчыцы
У хвіліну гневу, у імгненне зла.

Ты памыеш раны і прыкрыеш з тылу,
Дзеля роду станешся нават хіжаком,
Набірае мужнасці і нязломнай сілы
Будучыня Нацыі з тваім малаком.

КЛІМОВІЧ

Мацяркам вояў...

А ваўчаняты падрастуць,
крыві захочуць.
Ты не трымай, іх трэба адпусціць!
Адбор прыроды кволы не праскочыць,
А моцным шанец славы дай здабыць!

Пусці ў лясы — хай кожны з іх убачыць
Нянавісць, грубасць, боль ды эгаізм!
У ваўчанятах тых малых, трымцячых,
Зародзіцца ад спуду гераізм!

І падрастуць яны, і стануць сілай
У абарону маці, быццам грозны меч.
І не трымай іх на грудзях да самае магілы.
Пусці, Ваўчыца, адпусці іх прэч!

Чырвоны дождж

І зноўку дождж, і зноў, чамусь, чырвоны.
Салоным шротам скуру апякае.
Па бездаражы роўна йдуць калоны,
Яшчэ не ведаюць, што недзе іх чакае!

Байцы сасмяглі, змораны паходам,
Але як крэмень кожны: моцны, дужы!
За Украіну — што ў агонь ім,
што ў балота!
Ёй аддаюць дазвання сэрцы й душы!

Браня блішчыць, наперадзе руіны,
І ворагі апошнія здыхаюць!
Крычаць салдатам: «Слава Украіне!»
«Героям Слава!» — у адказ гукаюць!

Лунае песня годна — гімн паходу!
Усмешка па абліччах прабягае:
Яны пайшлі у бой не за ўзнагароду —
За ўчынак гэты Вечнасць іх прымае.

Ольбег РАРОГ

Двойчы не паміраць

Перасякаючы таемна межы ночы,
Нябыту браму трэба перайсці,
Багам арыйскім зазірнуўшы ў вочы
Ды прашчурам, што зніклі ў забыцці,
Ты азірнешся, толькі будзе позна,
Калі адказ трымацьмеш на судзе,
І прадзед запытаецца з пагрозай:
«Што дзеля мэты ты зрабіў,
калі і дзе?»
Тады ў цябе не знойдзецца адказу,
Таму што ўсё жыццё маніў сабе —
І шаблю на паноў не ўзняў ні разу,
Каб не забілі кнутаўём цябе.
Запомні толькі: не ўміраюць двойчы,
І лепей з гонарам загінуць у баі,
Чым апусціць бязвольна долу вочы,
Згарэць ад сораму сярод братоў сваіх...

Баявая замова

Тварам на Поўнач звярнуся —
Продкам сваім пакланюся,
Слова за Род трымаю,
Сілы ў Багоў пытаю!

Куля мяне аблятае,
Жалеза мяне абмінае,
Агонь і вада абцякаюць —
Ворагаў даганяюць!

Скура мая — панцыр з крыцы,
Кроў жа — з жывой вадзіцы,
Сокала шляхам крануся,
Воўкам перавярнуся!

Вятрамі ўкрыюся,
Снягамі ўмыюся,
За зямлю стаю,
Свой Род бараню!

Уладзімір УХАЧ

Паэты

Калі ў нацыі
праваднікоў няма,
Тады праваднікі яе — паэты.
Е. Маланюк

У вогненным горане плавім метал,
Што ў жылах крыві заместа.
І з кубкаў халодных гарачы запал
Мы ў словах каваных змесцім.

Разбёныя літары сэрцаў знарок
Развеем па свеце міфам.
І ранім душу, нібы спраўны стралок,
Рэчытатывам з граніту.

І рухне пад ногі са шлаку сцяна,
Спрэс у хлусні ды брудзе.
Магутнае рэха тут будзе лунаць,
І праўду пачуюць людзі.

Сатлее ў нябыце падману труна,
І путы згніюць дарэшты.
Няма калі ў нацыі праваднікоў —
Ім станцуца ёй паэты.

Пераклаў з украінскай мовы
Сяргей Сыс

Пакліканая будучыняй

Валянціна Коўтун

RFE/RL

1

Не думалася, што некалі буду пісаць успаміны пра Валянціну Коўтун. Не толькі ў далёкім 1967-м годзе на рэспубліканскім творчым семінары, скліканым Анатолем Вярцінскім, калі ўпершыню ўбачыў яе, дзяўчыну маладую і энергічную. Не думалася пра такое і нашмат пазней, калі наш творчы саюз панёс невымоўную страту — пакінула белы свет Жэня Янішчыц, і тады, як мы разам з Валянцінай завіталі на Жэніну радзіму ў лістападзе 1998-га адзначаць 50-я ўгодкі з дня народзінаў выбітнае паэткі. Не прыходзіла сумная думка і значна пазней, ужо ўвосень 2010, калі Валянціна Міхайлаўна брала ўдзел у маёй вечарыне ў музеі Якуба Коласа, хоць я ўжо ведаў, што ў яе ёсць праблемы са здароўем. Не думалася пра сумнае хоць бы таму, што яна была маладзейшая за мяне, а душу апаноўвала такая напружаная духоўная праца, якая, здавалася, не магла адпусціць яе заўчасна ў вечны вырай.

На юбілейнай вечарыне Валянціны Коўтун у красавіку 2011 года, якая праходзіла ў Музеі гісторыі беларускай літаратуры ў Менску, мне далі слова напрыканцы ўрачыстасці. Надта шмат ужо выступіла прамоўцаў. Вечарына забуксавала. Я мусіў быць лаканічным. Насупраць сядзеў Уладзімір Конан, і мне падумалася пра тое, з кім КОЎТУН суседнічае ў нашым пісьменніцкім даведніку. Суседзі цудоўныя: Колас, Конан (а яшчэ — Корбан, Корзун, Коршак). Паколькі яе імя па бацьку — Міхайлаўна, то мне было прыемна пачаць гаворку з таго, што Валянціна Коўтун у кагорце Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча (Коласа) і Уладзіміра Міхайлавіча Конана. Тады было весела. А калі неўзабаве не стала Уладзіміра Конана, падумалася: «Засталася толькі Валянціна Міхайлаўна». На вялікі жаль, праз лічаныя дні смерць забрала і Валянціну. Журба-скруха поўніла маё сэрца.

У памяці пачалі паўставаць эпізоды сустрэч з таленавітаю творцай на семінарах, на сходах, з'ездах і вечарах нашае пісьменніцкае суполкі, у літаратурных музеях, на лецішчах (там нашыя хаты — побач), дзе яна была вельмі рэдка. Вядома ж, не забылася супрацоўніцтва ў часопісе «Полымя», дзе мы два гады шчыравалі ў адным кабінеце.

Калі гаварыць пра чалавечыя якасці выдатнай творцы, то павінен адзначыць: яна была вельмі надзейная, пунктуальная — якасць рэдкасная, калі ўлічыць вечную занятасць творчае асобы, — мела бясспрэчныя арганізатарскія здольнасці. Інакш ці змагла б паспяхова шмат гадоў ачольваць аддзел крытыкі і літаратуразнаўства ў рэдакцыі часопіса «Полымя», які з'яўляўся эпіцэнтрам літаратурнага жыцця краіны.Там яна пачувалася як рыбка ў вадзе. Заказвала артыкулы самым вядомым творцам, дапамагала менш вядомым аўтарам давесці да ладу іх развагі пра нацыянальную літаратуру; не раз гадзіну і больш ахвяроўвала на гутаркі з аўтарамі будучых публікацыяў ці ўзгадняла з імі прапанаваныя праўкі. Размаўляла ціха (бо ў кабінеце нас, супрацоўнікаў рэдакцыі, было шасцёра), але пераканаўча.

Яе дасведчанасці і красамоўству можна было пазайздросціць. Я любіў яе высокадухоўныя гутаркі з Галінай Шаблінскай па радыё ў вядомай праграме «Гаспода».

Валянціна добра арыентавалася не толькі ў айчыннай літаратуры, а і ў многіх літаратурах свету, да прыкладу — ва ўкраінскай (пэўна, глыбокія філалагічныя веды набыла ў часе вучобы ва Украіне, у Львоўскім універсітэце). Не выпадкова яе з задавальненнем запрашалі ў Дом дружбы на імпрэзы, прысвечаныя ўкраінскім геніям.

Яна была вельмі надзейная, пунктуальная — якасць рэдкасная, калі ўлічыць вечную занятасць творчае асобы, — мела бясспрэчныя арганізатарскія здольнасці

Фэсты з яе ўдзелам запаміналіся, як, напрыклад, вечарына ў Парэцкай школе, дзе ў адпаведную дату ўшаноўвалася памяць непараўнальнай зямлячкі. Валянціна Міхайлаўна паклікала туды, разам з Жэнінай матуляй Марыяй Андрэеўнай і сынам Андрэем, людзей, якія шчыра любілі цудоўную паэтку (сярод іх была народная артыстка краіны Марыя Захарэвіч), забяспечыла нас камфартабельным транспартам, а там, у школе, хораша выступіла перад поўнаю залаю.

Пазней, праз дванаццаць гадоў, калі даведалася, што ў Белаазёрску ладзяцца паэтычныя чытанні, свята памяці Ніны Мацяш, вельмі хацела паехаць на радзіму Ніны Язэпаўны, ды месца ў машыне ёй, на жаль, не знайшлося. Але няўрымслівая Валечка прывітала «Бабіна лета ў Белаазёрску–2010» тэлеграмай.

Усё сказанае наводзіць на думку, што радкі Валянціны Коўтун пра маштабную духоўную постаць Цёткі («Здаецца, усё душой бы абняла…» і «Кветку белую — Беларусь прытуліла да сэрца жанчына») у поўнай меры можна аднесці да яе самой, творцы і патрыёткі, самаахвярнай, апантанай, памяткой.

2

Успаміны, успаміны… Мы з Валянцінай не былі надта блізкія сябры, але як творцы «стартавалі» ў адной прасторы і ў адным часе. Зрэдку, натуральна, абменьваліся аўтографамі. На тытульнай старонцы яе паэтычнае кнігі «На зломе маланкі» (1981) чытаю: «Васілю Жуковічу, — аднаму са слаўных, шчырых паэтаў нашага пакалення — з даўняй сімпатыяй. В. Коўтун. 28.02.1982 год».

Тады яе талент набіраў вышыню, прыкметныя творчыя дасягненні былі наперадзе. Што да названага зборніка, то ў ім вылучалася паэма, прысвечаная духоўнай постаці Алаізы Пашкевіч (Цёткі). Гэтая наскрозь вобразная паэма засведчыла выразнае ўсведамленне аўтаркі, што шлях нашага краю, які стагнаў «пад арлом двухгаловым», да свабоды — пакручасты. Не забыты Кастусь Каліноўскі. Яго трагічны подзвіг узрушае жывыя душы беларусаў і абнадзейвае:

Унук паўстання,
дай жа мне руку;
Ідзе за Цёткай хлопчык
несмяротны,
І страшна так жалезнаму
ваўку —
«Мужыцкай праўды»
коцяцца палотны.
……………..
Ідзі, унук бялявы, праз лясы,
Купалля кветка блісне
сярод ночы…

Які ж нечаканы і цікавы вобраз — «унук паўстання»!..

Узброеныя да зубоў улады баяліся не толькі паўстання Каліноўскага, не толькі яго геніяльна-бескампраміснай «Мужыцкае праўды»:

Б'юць указам, нянавісцю,
плёткай,
Каб хоць гэтак свой страх суняць
Перад словам, што скажа ім
Цётка…
Суд ідзе…
Грамадзяне, устаць!

Так, самаўладдзе страшылася праўдзівага і мужнага слова Пашкевічанкі.

Пазней Валянціна Коўтун гэты твор трансфармуе ў драматычную паэму «Суд Алаізы», якую наблізіць да XXI стагоддзя:

Народ, як лес. Ды колькі дрэў
струхлелых!
…………
Ёсць пацукі. Ёсць геніі радзімы…
Каго ты, будучыня, станеш зваць
сваімі?

Яна была мэтанакіраваная і апантаная беларушчынай. А пра эпічныя палотны мроіла, магчыма, пад уплывам Івана Мележа. Ёй карцела распавесці свету пра Еўфрасінню Полацкую. Але для рэалізацыі запаветнае мроі спатрэбілася перайсці мяжу між XX і XXI стагоддзямі. Мне здаецца, яна была пакліканая будучыняй для стварэння менавіта жаночых светлазорных вобразаў. Не ведаю, хто стаяў на чарзе. Магчыма, Геніюш? Мяркуючы па тым, як у 2009 годзе ў яе з'явілася «Малітва да Калымы» пад імем Лесі Беларускі, яе дужа хвалявалі лёсы «тысяч і тысяч ні ў чым не вінаватых пакутніц-лагерніц, для якіх страшней за самую лютую смерць была страта ўласнага гонару і чалавечай годнасці». Вобраз гулагаўскай гераіні і ў прозе ёй быў па сіле. Ейны таропкі почырк гаворыць мне пра многае…

3

Калі мне знакамітая кампазітарка Алена Атрашкевіч прапанавала стварыць лібрэта для оперы пра Еўфрасінню Полацкую, мне інтуіцыя падказала звярнуцца да Валянціны Коўтун з пытаннем, ці не занятая такім клопатам яна. І неўзабаве, калі стрэў Валю на лецішчы, высветлілася, што праца над лібрэта ёю завяршаецца. Я пацікавіўся, хто ж кампазітар. Яна назвала Алега Залётнева.

«Яна паспела паставіць кропку», — сказаў мне Алег Барысавіч пра лібрэта, названае паэткай «Шлях палачанкі».

Але опера, на вялікі жаль, не пішацца. Вядомы кампазітар пачаў як бы апраўдвацца, што гэта занадта буйны жанр, каб пісаць у стол. Аказваецца, ні оперны тэатр, ні тэатр музкамедыі, ні міністэрства культуры не благаславілі яго на стварэнне першай і ўнікальнай беларускай хрысціянскай оперы. Цяпер, калі мной прачытана лібрэта ў «Выбраным», апошняй кнізе Валянціны Коўтун, складзенай ёю, я пераканаўся: не паэтка вінаватая ў тым, што твор пра знакамітую асобу Беларусі аказаўся незапатрабаваны. Вінаваты нізкі духоўна-маральны стан грамадства краіны, дзе пануе страх браць на сябе адказнасць. Страх у дадзеным выпадку няцяжка ўявіць: а раптам наверсе хтосьці нездаволены зморшчыцца! А раптам пойдзе дакор: «Вы што, «Шляхам палачанкі» заклікаеце моладзь у манастыры, у манахі пры нашым дэмаграфічным тупіку?!..»

Гора нам, як кажуць азіяты. Зрэшты, там, у вечнасці, дзе пачаўся новы адлік часу Валянціны Коўтун, невялікі зямны перыяд, з яго недарэчнасцямі і амаральнымі вывіхамі, страхамі і брыдкай прыстасаванасцю, неістотны… Яна пакліканая будучыняй!

Васіль Жуковіч

Памяці паэта Ігара Канановіча

«Я — астэроід.
Я — Сусвету блудны сын»

Ігар Кананові́ч

…ці хто зацягне тугі пятлю,
ці ступіць далей за край…
Кожнага з іх, як сябе, люблю…
Божа, не пакідай…

Мы ў Цябе шукаем адхлань,
спагады з Тваіх рук,
выратавальнікам
нашым стань —
вырві адчаю крук,

вярні бяздушным Ты на зямлю
з нябёс жывую душу,
таму што іх таксама люблю,
аб чым і Цябе прашу…

Таго ж, хто выраку наўздагон
зрынуўся з вышыні,
прымі ў суплёт
Сусвету свайго,
а дух — Айчыне вярні.

20 чэрвеня 2016 года
Леанід Галубовіч

«Прастора і час»

Выйшаў у свет самы гарачы нумар часопіса «Дзеяслоў» — чэрвеньскі (№ 82). Ёмкі па аб'ёме і змесце, ён утрымлівае раўнавагу чытацкіх прыхільнасцяў: трымаецца класічнай традыцыі беларускага краснага пісьменства і спрабуе не адхіляцца ад перспектыўных накірункаў у сучасным літаратурным працэсе.



Чытаючы навінкі замежнай літаратуры і параўноўваючы іх з найбольш яркімі творамі нашых пісьменнікаў, я не адчуваю той «адсталасці і замшэласці», пра што нярэдка пішуць няўрымслівыя крытыкі ў перыёдыцы і асабліва ў электронных СМІ. Як і ва ўсім іншым, у мастацтве таксама ўсё адносна. Ці не таму, па словах расійскага паэта, «*вялікае бачыцца на аддаленні*»…

Пачну з таго, што, на мой погляд, падалося найбольш вартым чытацкай увагі. Найперш, гэта нізка выдатных вершаў **Уладзіміра Някляева.** Скажам, не чакаючы віншаванняў, гэта сапраўдны падарунак паэта сваім чытачам да ўласнага юбілею. Класная, хоць ужо і пазнавальная, паэзія, за выняткам некалькіх тэкстаў, створаная «па законах лага-рыфмічнай лінейкі». Зрэшты, не будзем намагацца надта пільна зазіраць у творчую лабараторыю майстра. І без таго бачна і адчувальна, што ў вершах абсалютна ўсё выверана: слова, думка, метафара, алюзія, рыфма, стыль…

Якая пустэльня! Вада ды аблокі!
І там, дзе аблокі, анёл сінявокі.
Нічога чужога. Прастора і час.
У Божай задуме — зямля пасля нас.

Калі б панятак «геніяльнасці» не быў зацёрты сённяшнім прагматычным часам натуральна да «дзірак», праз якія прасвечвае багемная мастацкая беднасць сучасных стваральнікаў, то можна было б назваць асобныя вершы Някляева менавіта такім высокім тэрмінам. Немалыя і няпроста пражытыя гады, жыццёвыя ды публічныя мітрэнгі не выхаласцілі таленту паэта. З чым яго і віншуем. І жадаем надалей прыслухоўвацца да ўласных інтуітыўных вычуванняў:

І сны аб небыцці,
і сны аб вечнай славе —
Пяньковая пятля на шыі тых,
хто спіць.
Паэт не можа спаць.
Калі ён спіць — ён сніць.
І жахі гэтых сноў збываюцца
на яве.

Безумоўна, да адметных і яркіх публікацый часопіса я дадаў бы і аповесць **Ігара Бабкова** «Францішак: словы за вакном». Хоць адносна жанру — аповесць гэта ці нешта іншае? — справа дзясятая. Не так важна. Насамрэч гэта туманная, адстароненая, фантасмагарычная гісторыя пра ўсё і нічога. Збор жыццёвых філасофскіх мініяцюр у адзін сюжэтны абсяг, на фоне якога цьмяна праяўляецца ўнутранае жыццё чалавека, высвечанае маланкавым крэсівам яго інтэлекту і памятлівай душы… Перад намі асоба, якая хоча зразумець свой зямны і быццёвы сэнс, сутнасць ці ад-сутнасць такога сэнсу ўвогуле… Новая проза без пэўных пачаткаў і няпэўных канцоў — уяўнасць Франка пра магчымасць слоў за вакном… Калі чытач прачытае п'есу У. Б. Ейтса «Словы на шыбіне», у гэтым жа нумары часопіса перастворaную па-беларуску Н. Харытанюк (жонкай Бабкова), то больш выяўна заўважыць адсылы і звязкі абодвух тэкстаў. Абстракцыі і спірытызм толькі спрабуюць прыадчыніць дзверы ў таямніцы аўтарскіх змыслаў… Складванне пазлаў наводзіць на думку пра вечную недасканаласць канструкцыі Сусветнага быцця… Прывяду ўласна сабраны фрагмент з тэксту, як адно з магчымых тлумачэнняў творчай ідэі аўтара:

«Словы былі занадта высокія. І безадказныя».

«Мова, падумаў ён тады, — усяго толькі сутнасныя адхіленні, вібрацыі сэнсаў. Дзеянне адхіляецца ў часе, імя — у прасторы. Разам яны звязваюць усё з усім. Мова ёсць гэтым звязам, спляценнем. Мова сплятае свет у адно. Мова і ёсць светам. Мова была мейсцам. Прытулкам. Домам быцця. Ён быў вартаўніком гэтага прытулку. Словы слухаліся яго, а ён іх. Але гэта было толькі тут, у прыцемках. У катакомбах».

«Страшна і хочацца адчыніць. У цябе было калі-небудзь такое адчуванне, запытаўся Далюс. Калі адтуль грукаюць і трэба адчыняць, а ты не ведаеш, дзе дзверы. Альбо нават ведаеш дзе і гатовы адчыніць, але яны закладзеныя? Я ўсё жыццё жыву з такім адчуваннем, сказаў Францішак».

«Ён дастаў сшытак і асадку, на ўсякі выпадак. Калі штосьці праявіцца, яны будуць пад рукой. Прытуліўся да шкла. І адразу праваліўся. У светлыя глыбіні часу. У тое, што калісьці было і засталося».

Яшчэ адзін юбіляр нумара — пісьменнік **Генрых Далідовіч** — прапануе нашай увазе дыптых «Юда для Каліноўскага». У першай апублікаванай частцы аўтар уводзіць чытача ў здрадніцкі свет тых, хто спрычыніўся да ўдушэння паўстання 1863 года і гібелі яго духоўнага і ідэйнага кіраўніцтва. Для гэтай місіі ў Менск генералам Мураўёвым накіроўваецца яго стаўленік па імперска-шавіністычных поглядах. І вось што даводзіць паліцэйскім паўночна-заходняга краю прысланы генералам-вешальнікам яго прадстаўнік, расейскі палкоўнік: *«Ну, а на заканчэнне, дадам тое, што залежыць не толькі ад нас з вамі, але і ад цывільных улад, — сказаў Зайцаў. — Літаральна на днях, першага студзеня, генерал-губернатар Мураўёў выдаў цыркуляр. Па ім навечна забараняюцца беларуская і літоўская мовы, іхні друк. Не дапускаецца ў дзяржаўнай перапісцы, у публічных выступленнях і польская мова. Хопіць. Няхай край больш настойліва прывучаецца да таго, хто тут гаспадар і што яго мова — усіхняя мова. Мы, падкрэслівае Мураўёў, не для таго сюды прыйшлі, патрацілі шмат сілаў, каб даваць патолю мясцовым звычаям і норавам, так званай самабытнасці, самалюбству, гонару, амбіцыям».*

Во гэтак проста ўсё было ў тыя часы: выдаў цыркуляр нейкі расейскі генерал — і ў цэлым народзе задушваецца ўсё нацыянальнае. І ці ж толькі ў тыя часы? А цяпер хіба падобныя дэкрэты не выдаюцца? Пытанне рытарычнае. Будзем чакаць другой часткі гістарычнага твора Г. Далідовіча. А пакуль — віншуем з юбілеем!

Вершы **Юркі Голуба,** як заўсёды, вельмі жывыя і майстравітыя (я сказаў бы — віртуозна выробленыя) з неардынарнай нечакана-свежай метафарай, з юрліва-заваблівай рыфмай… Што праўда, змест яго вершаў не новы, але сэнс лепшых твораў абапіраецца на мудрасць і немалы жыццёвы вопыт паэта:

Знікаў на досвітку туман:
Напэўна, мае недзе спраты,
Дзе на расхрыстаных тамах
Заснуў анапеста аматар.

Навелы **Уладзіміра Сцяпана** можна назваць помнымі і занатаванымі падрабязнасцямі звычайнага чалавечага жыцця. Можна дадаць: беларускага простанароднага жыцця… Дробязі У. Сцяпана дужа важкія і, як урэшце аказваецца, часам нават вызначальныя на захадзе чалавечага жыцця. Як бы нічога новага: мала сонца, многа ценю і шэра-стракатых прасветаў, шчылін, зачэпак, стрэмак, дыму, што праступае з паўзмроку нашай падсвядомасці. Спроба захавання пражытага…

Ганна Галавіна, у адрозненне ад сваіх сучасніц, паэтка ціхая, сентыментальная, шчырая… Да яе паэзіі ўзнікае давер. А вершаваныя радкі Ганны да свайго каханага нагадваюць мне яе зварот да ўласнага чытача:

Дыханне — крыло
патрывожаных птахаў.
Не трэба баяцца пяшчоты
нямой.
Тым больш, што і я паміраю
ад жаху.
Ад лёгкага ценю ўвагі тваёй.

Апавяданне **Сяргея Дубаўца** «Жэнеўеў» больш нагадвае эсэ з грамадска-публіцыстычным ухілам, нераўнуючы як пашыраны і мастацка апрацаваны блог гэтага ж аўтара на сайце РС. Але ў самім тэксце шмат трапных алюзій, таму чытаецца ён з цікавасцю. Своеасаблівая спроба разгадкі нацыянальнай ментальнасці беларусаў, чым, як я заўважаю, спадар Дубавец ужо даўно пераймаецца ў сваёй журналісцкай і літаратурнай творчасці. Пастаяннае самакапанне — і ёсць адной з адметных рысаў нашага менталітэта. Некаторыя вытрымкі з тэксту:

«…ён быў такі самы, як і ўсе. Між беларусаў шмат людзей, пра якіх нічога асаблівага не скажаш, нават таго, што яны беларусы»;

«Ці не таму, што ўсё ў Беларусі было з падвойным дном? Паміраць рыхтуюцца, але не збіраюцца. Кажуць, што родная мова ў іх беларуская, а гавораць па-расейску. Нездарма ж найвялікшы літаратурны твор у іх называецца «Дзве душы» — нібы сапраўдная іхняя канстытуцыя пры тым, што і звыклая Канстытуцыя ў іх нібыта ёсць».

Хара́ктэрныя, валявыя вершы **Сержука Сыса.** Лірыка грамадзянскага гучання. У ёй ёсць доля пафаса, але няма надуманасці і гульні. Як *«адлюстраванне»* сказанага — цытата з аднайменага верша:

Вада падманвае, выявы рэчаў
размывае,
Здаецца, там, на глыбіні,
таемны дзіўны сад…
А там — каменьчыкі блішчаць
і перліна старая,
Усё, што звалася душою шмат
гадоў назад.

Макс Шчур друкуе два аповеды («Бабуля» і «Уратаванне»). Першы — гэта лірычна-сентыментальны ўспамін, даволі нечаканы тэкст для гэтага пісьменніка, які павярнуў маю прыхалоджаную прыхільнасць да сваёй творчасці. Жывое апавяданне аўтара, як пульсуючая венная кроў, — гэта і ёсць мастацтва. Ці не таму другі аповед — на палітычна-злабадзённую тэму — ужо не зрабіў на мяне асаблівага ўражання: сухі, статычны, мусова змыслены…

Вершы **Валерыі Куставай** пачуццёвыя і экспрэсіўныя — у стане эмацыянальнага хістання намацваецца раўнавага і гармонія… Што ж, цяпер у яе такі перыяд:

Раней турбавала:
«верш, а не ты!»,
«сыдзі прэч з маёй волі!»
Цяпер —
вершаняты
мае
ў абдымках тваіх
спатолю.

Вершы **Ірыны Мацкевіч** напісаныя ў традыцыйным стылі — статычныя, роўна выстраеныя. Шмат лірычнага зместу наводдаль паэзіі…

Ганна Комар — наадварот — піша вершы неардынарныя, імпульсіўныя, падчас дзёрзкія і правакацыйныя, — тыя, што цяпер у «модзе». Некаторыя мне спадабаліся. Талент у Ганны несумненна ёсць, але ён яшчэ не настолькі праявіўся, каб зняць «скуру з душы», а не «з цела». Аднак неўзабаве такога ад яе можна чакаць…

Леанід Дранько-Майсюк працягвае публікацыю кнігі гістарычных эсэ «У Вільні і больш нідзе». Гэтым разам — пра дзяржаўнага сакратара БНР, архітэктара Клаўдзі Дуж-Душэўскага.

Наталля Харытанюк пераклала п'есу **Уільяма Батлера Ейтса** «Словы на шыбіне», а Ганна Янкута перастварыла «Метамарфозы» польскага паэта **Баляслава Лесьмяна.**

Паэт і літаратуразнаўца Віктар Жыбуль прапануе цыкл вершаў з літаратурнай спадчыны **Алеся Наўроцкага.** Публікацыя цікавая як факт літаратуры і абрыс не да канца спраўджанага адметнага творчага лёсу таленавітага паэта. Я думаю, трэба было быць адэкватным чалавекам, каб у 2009 годзе пісаць такі верш:

Калі блыха дабярэцца да цела
і, галодная, смокча кроў,
дык чалавек, як ашалелы,
смяротных дае блысе пляскачоў.
Калі ж блыха дабярэцца да трону
і вып'е кроў у моры людзей,
дык люд пазірае на яе,
нібы на ікону,
і ўзводзіць ёй маўзалей.

Ну і зусім сцісла — пра тэксты па-за мастацкімі жанрамі.

Навуковец **Вадзім Корань** да 70-годдзя паэта Васіля Гадулькі публікуе вельмі цёплы, з любоўю і разуменнем напісаны артыкул «Шлях мой самотны…». На гэтым матэрыяле варта затрымацца чытацкаму воку. Крытык і літаратуразнаўца **Вячаслаў Рагойша** знаёміць сучасных чытачоў з Кандратам Крапівой як мастацкім перакладчыкам. «І не толькі…» Напраўду артыкул займальны і прыцягальны, напісаны душэўна і раскавана. Літаратуразнаўца **Анатоль Трафімчык** спрабуе на падставе «Песні жаўнераў 1794 года» і «касцюшкініяны» падняць тэму ідэнтыфікацыі беларускай мовы і «нацыянальную дыферэнцыяцыю ў мадэрных катэгорыях Новага часу». Артыкул прыўрочаны да 260-годдзя Тадэвуша Касцюшкі.

Крытык **Пятро Васючэнка** ў артыкуле «Утопія ці антыўтопія?» накрэсліў суб'ектыўныя подумкі адносна набыткаў і магчымай перспектывы беларускай літаратуры, маючы на ўвазе яе «жанравы рух XX–XXI стагоддзяў». **Алена Масла** ў артыкуле «Шклянка, поўная напалову» спрабуе зрабіць дыягностыку працэсаў у сучаснай дзіцячай літаратуры. **Ніна Каленчыкава** дзеліцца думкамі пра творчасць самабытнай мастачкі Алены Кіш, якой сёлета споўнілася б 120 гадоў. Бібліёграф з Нью-Ёрку **Лявон Юрэвіч** нагадвае пра «трэцюю крыніцу й трэці складнік рамана «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» Уладзіміра Караткевіча. Даследчык Біблії з Бабруйска **Сяргей Пятровіч** распавядае пра «беларускія прозвішчы праз прызму старажытнагабрэйскай мовы». Аўтар гэтага опуса рэцэнзуе перакладзеную на беларускую мову кніжку «Клетка для івалгі» ўкраінскага пісьменніка Уладзіміра Даніленкі.

Чытайце, пашырайце свой творчы дыяпазон. Сезон летніх адпачынкаў таму спрыяе.

ЛеГАЛ

ПРЭМІІ

Прэмія прынцэсы Астурыйскай

Іспанія ўганаравала прэміяй прынцэсы Астурыйскай у галіне літаратуры амерыканскага пісьменніка Рычарда Форда.

Сярод вядомых твораў 72-гадовага аўтара — раманы «Спартыўны журналіст» і «Дзень незалежнасці», зборнік «Рок-Спрынгс». За «Дзень незалежнасці» Р. Форд у 1995 годзе атрымаў Пулітцэраўскую прэмію.

Журы іспанскай узнагароды назвала пісьменніка «вялікім хранікёрам мазаікі пераплеценых гісторый, якой з'яўляецца амерыканскае грамадства».

Прэмія — адна з васьмі, якія штогод уручаюцца Фондам кронпрынцэсы Леаноры. Яны прысуджаюцца таксама прадстаўнікам навукі, спорту, грамадскім дзеячам. Раней гэтую ўзнагароду атрымалі пісьменнік Філіп Рот, драматург Артур Мілер, рэжысёр Фрэнсіс Форд Копала.

Паводле «BBC»

Прэмія братоў Стругацкіх

У Пулкаўскай абсерваторыі Пецярбурга аўтарам фантастычных твораў 18-ы раз уручылі міжнародную літаратурную прэмію братоў Стругацкіх.

Лаўрэатам АВС-прэміі, названай па ініцыялах знакамітых пісьменнікаў, стаў масквіч Роберт Ібатулін. Перамогу яму прынёс дэбютны «ваенна-шпіёнска-палітычны» касмічны раман «Ружа і чарвяк», над якім ён працаваў два гады.

Таксама ў намінацыі «Мастацкая проза» адзначылі Марыю Галіну за раман «Аўтахтоны» і Кірыла Яськова за кнігу «Амерыка (reload game)».

У намінацыі «Крытыка і публіцыстыка» лаўрэатамі сталі аўтары з Сібіры Генадзь Прашкевіч і Уладзімір Барысаў (за біяграфічную кнігу «Станіслаў Лем»).

Усе фіналісты атрымалі грашовую ўзнагароду. Акрамя гэтага, ім уручылі малюнак зорнага неба з астэроідам 3054, названым імем Стругацкіх, а таксама сямігранную гайку, якая не існуе ні ў прыродзе, ні ў тэхніцы.

Паводле «Российской газеты»

«Майн Кампф» у Італіі

Італьянская газета «Il Giornale» апублікавала тэкст Адольфа Гітлера «Майн кампф» («Мая барацьба»), які спалучае ў сабе элементы аўтабіяграфіі ды ідэі нацыянал-сацыялізму, асобным накладам. Публікацыя выклікала шырокую палітычную дыскусію на Апенінах.

Галоўны рэдактар «Il Giornale» Алесандра Салусці вырашыў зрабіць дадатак — першы з васьмі тамоў палітычнага маніфеста Гітлера — да новага нумара газеты. Любы ахвочы можа атрымаць яго, вырашыўшы набыць газету.

Рашэнне А. Салусці выклікала асуджэнне з боку габрэйскай абшчыны Італіі, пасольства Ізраіля і многіх італьянскіх палітыкаў, у тым ліку прэм'ер-міністра краіны Матэа Рэнца.

«Я лічу вартым жалю, што італьянскі штотыднёвік дорыць сёння «Майн кампф» Гітлера», — напісаў М. Рэнца ў Фэйсбуку.

А пасольства Ізраіля ў Рыме выказала «здзіўленне» ў сувязі з публікацыяй «Майн кампф», габрэйская абшчына назвала тое, што здарылася, «непрыстойным учынкам».

Аднак галоўны рэдактар «Il Giornale», адказваючы на крытыку, сказаў: «Каб зразумець, як магло нарадзіцца гэтае абсалютнае зло, трэба звяртацца да крыніцы і не баяцца разглядаць трагедыі XX стагоддзя ў агульным гістарычным плане».

На пачатку траўня паведамлялася, што ў Нямеччыне кнігу Адольфа Гітлера «Майн кампф» могуць уключыць у школьную праграму...

«Майн кампф» з'яўляецца аўтабіяграфіяй лідэра нацыстаў, у якой ён таксама выказаў асноўныя прынцыпы ідэалогіі сваёй партыі.

Паводле «The Local»

Львоўская прэзентацыя архіваў спецслужбаў

У Львове работнікі Нацыянальнага музея-мемарыяла «Турма на Ланцкога» і Цэнтра даследаванняў вызвольнага руху прадставілі грамадскасці зборнік «Дакументы камуністычных спецслужбаў у Еўропе. Даведнік сеткі архіваў».

Яго складальнікі паставілі сабе мэту: дапамагчы сучаснаму чытачу зразумець, як у свой час нашы суседзі ў Польшчы, Германіі, Чэхіі, Славакіі, Венгрыі, Балгарыі і Румыніі адкрывалі архівы ўласных службаў бяспекі.

Выданне гэтай вельмі актуальнай для нашай грамадзянскай супольнасці кнігі ажыццёўленае Цэнтрам даследаванняў вызвольнага руху пры садзейнічанні Міжнароднага фонда «Адраджэнне». Бо ўкраінскае выданне — гэта перакладзеная і адаптаваная версія зборніка, якім карыстаецца Еўрапейская сетка інстытутаў, адказных за архівы спецслужбаў.

Зборнік распавядае пра тое, як еўрапейскія краіны пераадольвалі шлях пераходу да дэмакратыі пасля распаду СССР, у якіх аб'ёмах захаваліся да гэтага часу дакументы камуністычных спецслужбаў і як заканадаўства розных краін рэгулюе пытанні доступу да тых дакументаў. У гэтым незвычайным даведніку прадстаўлена інфармацыя пра архівы былых камуністычных спецслужбаў Балгарыі, Германіі, Чэхіі, Венгрыі, Польшчы, Румыніі і Славакіі.

Дар'я Кучарэнка, vsiknygy.net.ua

Пуцін пра добрую літаратуру

Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін заявіў, што Расіі трэба больш добрай літаратуры, і не толькі ваеннай.

Пра гэта ён сказаў на сустрэчы з прадстаўнікамі Агульнарасійскага гістарычнага схода. Працытаваўшы ўрывак аб пераправе з паэмы Аляксандра Твардоўскага «Васіль Цёркін», прэзідэнт адзначыў, што ў цяперашні час патрэбны такія творы літаратуры, якія «бяруць за душу».

«Ваенная тэматыка вельмі важная, але нам не менш трэба пазітыву сённяшняга дня, будучыні. Без ведання ўласнай гісторыі немагчыма глядзець у будучыню», — адзначыў ён.

«У галаве Пуціна»

Менавіта так — «У галаве Пуціна» — называецца кніга, у якой Мішэль Ельчанінаў аналізуе дактрыну, якая вызначае сёння светапогляд расійскага прэзідэнта і палітыку Расіі.

Прафесар Сарбоны, доктар навук, рэдактар аўтарытэтнага французскага «Філасофскага часопіса», вядомы даследчык творчасці Ф. Дастаеўскага, — і раптам вырашыў напісаць пра Пуціна-філосафа? Хоць вядома, што ніякім філосафам расійскі прэзідэнт не з'яўляецца, хоць цытуе часам Канта, Салаўёва, Бярдзяева...

Цікавасць М. Ельчанінава да гэтай асобы і гэтай тэмы можна растлумачыць хіба што тым, што ён — нашчадак рускіх эмігрантаў, унук святара Аляксандра Ельчанінава — сочыць за падзеямі ў Расіі і цікавіцца яе будучыняй.

Аўтар кнігі «У галаве Пуціна» сцвярджае, што ў Расіі склалася новая нацыянальная дактрына, якую варта сур'ёзна прааналізаваць, каб зразумець, што чакае краіну і яе суседзяў. Дактрыну гэтую стварае, зразумела, не толькі прэзідэнт, але ў яго словах і дзеяннях яна праяўляецца найвыразней. М. Ельчанінаў умоўна зводзіць яе да трыяды: кансерватызм, тэорыя асаблівага «рускага шляху», атрыманая ў спадчыну ад славянафілаў, і Еўразійства.

Ён падрабязна спыняецца на поглядах Мікалая Бярдзяева, Уладзіміра Салаўёва, Івана Ільіна і некаторых іншых рускіх філосафаў (у прыватнасці, антызаходніка Мікалая Данілеўскага ці «рускага Ніцшэ» Канстанціна Лявонцьева), якія вызначаюць сённяшні светапогляд Пуціна — і «легітымізуюць пуцінскую вертыкаль улады».

Мабыць, толькі пра Івана Ільіна варта сказаць некалькі слоў: уж вельмі гэта адыёзная фігура. Рэлігійны мысляр, адзін з духоўных правадыроў белай эміграцыі, І. Ільін стварыў ідэалогію рускага дзяржаўнага патрыятызму, лічыў, што ў Расіі свой адмысловы шлях, і заходнія дэмакратыі — ёй не прыклад. Такія паняцці, як «нацыянальны лідэр» і «духоўная знітаванасць», — з яго лексікону. І. Ільін называў нацыяналізм «станам правільным і апраўданым», што прывяло філосафа і да такой высновы: «Фашызм меў рацыю, паколькі зыходзіў са здаровага нацыянальна-патрыятычнага пачуцця».

Філасофія Івана Ільіна вельмі блізкая Мікіту Міхалкову, які, як думаюць, і «адкрыў» яго Пуціну. А пасля таго, як расійскі прэзідэнт некалькі разоў працытаваў І. Ільіна ў сваіх выступах, той стаў лічыцца ва ўладных расійскіх колах бясспрэчным духоўным аўтарытэтам. Разам з тым, Іван Ільін, Канстанцін Лявонцьеў і Леў Гумілёў (з яго ідэяй еўразійскай прасторы, якая супрацьстаіць «атлантычнаму свету»), — гэта, як падкрэслівае аўтар кнігі «У галаве Пуціна», самае рэакцыйнае крыло вялікай рускай культуры.

Зразумела, Пуцін цытуе не толькі іх, але і, напрыклад, Мікалая Бярдзяева. Тут М. Ельчанінаў катэгарычны: Пуцін проста не ведае філасофіі Бярдзяева і, хутчэй за ўсё, зачытвае тое, што падрыхтавалі яму памочнікі. Бо якраз Бярдзяеў быў выразным праціўнікам палітычнага кансерватызму ды імперскай ідэалогіі. Адной з найважнейшых у яго філасофіі была катэгорыя свабоды, вольнага чалавека.

Нагадваючы пра гэта, М. Ельчанінаў заўважае: «Дзякуй Богу, у расійскай філасофіі ёсць шмат мысляроў, якія не маюць ніякага дачынення да імперыялізму». Але, дадае аўтар кнігі, філасофскія крыніцы «пуцінізму» вызначаюцца іншымі «фундаментальнымі трэндамі: імперскай ідэяй і апалогіяй вайны».

Для даследчыка абсалютна відавочна: Пуцін толькі «падганяе» рэальныя і ўяўныя філасофскія канцэпцыі пад сваю ўласную геапалітычную дактрыну, абапіраючыся на праарокаў кансерватызму, асаблівага «рускага шляху» і «еўразійскай імперыі» ў антызаходняй, агрэсіўнай палітыцы прасавецкага ўзору. Гэты «гібрыд», па выказванні аўтара кнігі, прадвяшчае нам усім неспакойную будучыню.

З гэтым песімістычным пунктам гледжання згодны, у прыватнасці, рэцэнзент газеты «Neue Zürcher Zeitung». Ён звяртае асаблівую ўвагу на тое, як «упісваюцца» ў новую крамлёўскую дактрыну і рэабілітацыя Сталіна, які зноў становіцца добрым (у першую чаргу таму, што ўмацоўваў імперыю), і ўзмацненне ролі праваслаўнай царквы (таму, што яна дае духоўную легітымізацыю «вялікарускай» імперскай ідэі).

У артыкуле газеты «Die Welt», якая расказвае пра кнігу «У галаве Пуціна», гаворыцца пра «элементы савецкага мыслення» і «савецкай мілітарыскай культуры», якія сёння адраджаюцца ў Расіі. Разам з эклектычнай філасофскай надбудовай вялікарускага нацыяналізму, лічыць рэцэнзент «Die Welt», тое павінна «навукова» абгрунтаваць прэтэнзіі Расіі на панаванне ў еўразійскай прасторы.

«...І саму ўладу Пуціна», — дадае аўтар газеты «Tageszeitung».

Паводле dw.com

Літаратурная Беларусь

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by